№ 26 (671) 14 ліпеня 2010

www.nn.by

незалежная газета

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыдня, у серады

**Рэйтынг папулярнасці палітыкаў**

Старонка 10



**Правакацыя Вітаўта. Грунвальд**

Старонка 12



**Вашай траве касец**

Старонка 11



## У НУМАРЫ

**Хросны бацька сканфіскаваў**

«Наша Ніва» з інфармацыяй пра «Хроснага Бацьку»: тыраж знік. **Старонка 2.**

**«Цыбульная рэканструкцыя» не спыняецца**

Нягледзячы на прадпісанне Мінкульта, працы на Барысаглебскай царкве ў Навагрудку працягваюцца. **Старонка 5.**

**Каралеўскі фінал, качавача Фарлан і васьміногі аракул**

Вынікі чэмпіянату свету. **Старонка 6.**

**Знішчаны помнік Багушэвічу?**

Не, рэканструкцыя. Чытачы «НН» на варце помнікаў. **Старонка 11.**

ТУРЫСТЫЧНАЕ АГЕНЦТВА «ГІСТОРЫЯ-ТУР»

- Тур на фестываль «Гальшанскі замак», 21.08.2010 (папярэдні продаж квіткоў і арганізаваная дастаўка транспартам)
- Аўтобусныя экскурсіі па Беларусі
- Адпачынак у Еўропе і на моры
- Карпаратыўны адпачынак у шляхецкім фальварку Карчэўскіх, што ў Бянюнах
- Шэнгенскія візы

(029) 677 00 46 www.h-t.by

«Наша Ніва» з’яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.

# Што ў Беларусі расійскае

**Банкі, газаправоды, запраўкі, гіпермаркеты, салоны сувязі, дэвелаперы...**

Як Расія праводзіць свае інтарэсы за мяжой? Паводле новай дактрыны, праз эканамічныя рычагі. І Беларусь тут — эксперыментальны палігон.

Лукашэнкаўская прапаганда падкрэслівае эканамічную незалежнасць краіны. Але ўжо сёння складана знайсці хаця б адну галіну беларускай гаспадаркі, у якой не круцяцца расійскія грошы. «Краіну не далі расцягнуць»? Але 8 з 32 банкаў ужо належаць расійцам. Усе высокапрыбытковыя сегменты рынку аказаліся альбо часткова акупаваныя ўсходнім капіталам, альбо знаходзяцца ў сферы пільнага інтарэсу суседзяў. Іх кампаніі не толькі зарабляюць у Беларусі. Яны з’яўляюцца тут своеасаблівымі праваднікамі расійскіх каштоўнасцяў. Агляд найярчэйшых прадстаўнікоў бізнэсу Расіі на тэрыторыі нашай краіны.



**Аграмадзіна новага пасольства Расіі ў Мінску.**

### Трубаправоды і запраўкі

Расійскую кампанію «Газпром», самую прыбытковую ў свеце па выніках 2009, варта разглядаць асобна ад іншых прадстаўнікоў нафтагазавага бізнэсу, бо столькі дыверсіфікаванай маёмасці няма ні ў кога іншага. Па-першае, гэта, вядома ж, 50% акцый «Белтрансгаза» разам з трубаправодамі. Па-другое — сетка аўтазаправак «Газпрамнафты—Белнафтапрадукта». Урэшце, кампанія з’яўляецца суўладальнікам акцый Мазырскага нафтаперапрацоўчага завода, «Белгазпрамбанка» і «Брэстгазаапарата». Урэшце, газаправод «Ямал-Еўропа», які праходзіць па тэрыторыі Беларусі, таксама газпромаўскі.

Апроч профільных актываў, варта ўзгадаць і пра ідэалагічныя рычагі «Газпрома». Тэлекампанія НТВ, а значыць, у прыватнасці, і «Хросны Бацька» — справа газпромаўскіх рук.

### Нафта, газ, паліва

Больш за 80 заправак па ўсёй краіне мае «Лукойл» алігархаў Вагіта Алякперава і Леаніда Федуна. Гэта рэкорд для прыватных кампаній. Абагнаць іх па колькасці АЗС хоча «Татнафта», інтарэсы якой лабіруе пасол Расіі ў Беларусі Аляксандр Сурыкаў. У татараў у мэтах адкрыццё 150 заправак, але пакуль не выкананая і траціна плану.

«Юнівест-М», які ажыццяўляе пастаўкі нафты з Ямала-Нянецкай аўтаномнай акругі ў Мазыр, а адтуль у Еўропу, у папярэднія гады ўваходзіў у тройку найбуйнейшых падаткаплатнікаў краіны. Цяпер часы іншыя, і ўнёскі «Юнівеста» паменелі.

**Працяг на старонцы 9.**

• На каго ў Беларусі можа абаперціся Расія? **Старонка 8.**

• Юры Баранчык: Някляеву пара вызначацца. **Старонка 8.**

• Адносіны між Лукашэнкам і Крамлём выйшлі на ўзровень пагрозаў смерцю. Піша Уладзімір Падгол. **Старонка 9.**

• Мілінкевіч: Прарасійскі кандыдат вызначыцца пазней. Лідэр Руху за Свабоду супраць яднання з прарасійскімі палітыкамі. **Старонка 10.**




# Бізнэс-імперыя прэзідэнта

**Нацыянальныя паркі, офісы, латарэі — такому набору пазайздросціў бы мільярдэр.**

Кіраўніцтва справаў прэзідэнта Беларусі — арганізацыя, якая жыве сама па сабе. Яе кіраўнікі, у народзе іх завуць «прэзідэнцкія заўхозы», трымаюць на нітках самыя прыбытковыя галіны эканомікі. І па тых самых нітках перакачваюць мільённыя прыбыткі падкантрольных арганізацый. Камусьці тое ўдавалася лепш, камусьці, як сумнавядомай Галіне Жураўковай, у якой выявілі растрату $3,6 мільёна, — горш.

Што ж уваходзіць у гіганцкую імперыю, падкантрольную асабіста кіраўніку дзяржавы? Па афіцыйных падліках, ажно 80 арганізацый маюць груваткі давесак да назвы, які ўказвае на гаспадара, — «Кіраўніцтва справаў прэзідэнта Рэспублікі Беларусь».

Сайт Кіраўніцтва справаў адзначае, што набор «птушанят»-небарак пад прэзідэнцкае крыло пачаўся ў сярэдзіне 90-х, калі шэраг прадпрыемстваў культурніцкага профілю былі стратнымі. Мэта была адна — захаваць прадпрыемствы для будучыні. Фабрыкі мастацкіх вырабаў, кераміка, сувеніры — сапраўды, падтрымка ім была неабходная. Але не адной керамікай жыло ўпраўленне справамі. Гандаль ад імя дзяржавы — вось асноўная крыніца прыбытку.

Кампанія пад някідкай назвай «Беларусьгандаль» дае такі абарот грошай, што іншым і не снілася. Імпарт алкаголю, цыгарэт і лесу — шматмільярдны заклад паспяховасці аптовага прадпрыемства. І такія арганізацыі яшчэ і атрымліваюць зніжкі «для бедных»! Напрыклад, увоз «Беларусьгандлем» каменнага вугалю ў краіну ў гэтым паўгоддзі нават не будзе абкладацца падаткамі.

**Працяг на старонцы 4.**

# Хросны бацька сканфіскаваў

### «Наша Ніва» з інфармацыяй пра «Хроснага Бацьку»: тыраж знік.

На мінулым тыдні «НН» сутыкнулася з новым відам цэнзуры. Палова накладу газеты №25 ад 7 ліпеня так і не трапіла ў рукі чытачоў. Адбылося гэта з асобнікамі, якія распаўсюджваюцца праз кіёскі «Белсаюздруку».

Звычайна «НН» паступае ў продаж у Мінску ў сераду ў абед, у рэгіёнах — у чацвер ад ранку. Сігналы, што газеты няма ў вольным продажы, пачалі прыходзіць у Рэдакцыю ў чацвер раніцай. У сярэдзіне дня званкі чытачоў набылі масавы характар.

Між тым, газета выйшла з друкарні звычайным парадкам, а 8-й у сераду. Тыраж быў звычайны — 6350 асобнікаў. І падпісчыкам газета прыйшла ў час.

Мы прачакалі да вечара чацвярга. Аднак газета так і не з'явілася ў продажы. Для праверкі работнікі «НН» аб'ехалі кіёскі ў розных раёнах Мінска, Гродна, Гомеля, Магілёва, Брэста, Ліды, Баранавіч. «Усе астатнія газеты прыйшлі, як звычайна, а «Нашай Нівы» чагосьці няма», — разводзілі рукамі кіяскёркі. «Вы не першы пытаецеся. Нам кіраўніцтва сказала, што гэты нумар не выйдзе», — адказала работніца аднаго з кіёскаў у Кунцаўшчыне. Ва Уручча нам адказалі: «Нам паведамілі, што рэдактар гэтага нумару не выпусціў. А можа, там як калісьці з «Тайнамі звёзд», дзе было нешта пра Лукашэнку, і нам прыйшло ўказанне тэрмінова зняць з продажу».

Галоўны артыкул мінулага нумару меў назву: «Хросны бацька капітуляваў». Тэмай мінулага нумару «НН» было ўступленне краіны ў Мытны саюз, скандальны фільм НТВ «Хросны Бацька» і рэакцыя на яго беларускіх уладаў. Трансляцыю той стужкі ў Беларусі перакрылі. Аднак весткі пра яе выклікалі вялікую цікавасць. На інтэрнэт-сайтах, у тым ліку і nn.by, якія далі інфармацыю пра фільм, артыкулы сталі самымі чытанымі матэрыяламі за апошнія 30 дзён. Ролік фільма на Ю-Т'юбе сабраў каля 120 000 праглядаў.

У аддзеле рознічных продажаў РУП «Белсаюздрук» на запыт рэдакцыі адказвалі: «Нічога не ведаем, на наш аптовы склад газета паступіла». Работнікі газетна-часопіснай экспедыцыі дэманстравалі супрацоўніку «НН» пусты склад — маўляў, газета развезеная па краіне.

Работнікі абласных «саюздрукаў» адказвалі па-рознаму. Вядучы спецыяліст аддзела перыёдыкі «Мінаблсаюздруку» Алена Церахава сказала, што на тым тыдні «НН» да іх не паступала. Тое самае — у Брэсце: начальнік аддзела арганізацыі гандлю «Брэстаблсаюздруку» Мікалай Марэйка паведаміў, што газету не прыслалі. Таваравед «Магілёўаблсаюздруку» Вікторыя Церашкова сказала, што да іх паступілі толькі накладныя на «НН» №25, а сама газета не прыйшла. «Дырэктар сказаў, што не будзе», — паведаміла яна.

«Не можа такога быць», — казала дырэктар «Віцебскаблсаюздруку» Людміла Южык. Паводле яе словаў, газета паступіла ў кіёскі без затрымак. У той жа час, чытачы ў Віцебску, Наваполацку і іншых гарадах вобласці «НН» у кіёсках не знайшлі.

І загадчыца аддзелам розніцы «Гомельаблсаюздруку» Тамара Богусь паведаміла, што газета ў Гомель паступіла і была развезеная па кіёсках. У той жа час, наш кар. газеты ў гомельскіх кіёсках не адшукаў.

У «Гроднаблсаюздруку» на гэтае пытанне адказаць не ўзяліся.

Зразумеўшы, што адбыўся не тэхнічны збой, а спланаваная акцыя, рэдакцыя выставіла на сайт nn.by у адкрыты доступ старонкі зніклага нумару, каб кожны ахвотны мог іх паглядзець і спампаваць сабе.

Лёс 3485 асобнікаў, якія «НН» штотыдзень адгружае «саюздрукам», застаецца нявысветленым. Рэдакцыя скіравала адпаведны зварот у Генеральную пракуратуру і Міністэрства інфармацыі. Не выключана, што давядзецца звяртацца і ў Гаспадарчы суд, бо панесеныя матэрыяльныя страты.

Самае цікавае пачнецца, калі «саюздрукі» дашлюць у Рэдакцыю лічбы спісання зніклага нумару. Калі спісанне за месяц будзе непрапарцыйна вялікім, гэта будзе значыць, што «саюздрукі» негалосна распісваюцца ў затрыманні нумару. Калі ж спісанне будзе звычайным, рэдакцыя мусіць атрымаць ад «саюздрукаў» грошы за «прададзены» нумар. Такая сабе форма дзяржаўнай датацыі незалежнай прэсе — першай за 15 гадоў.

Вядома, не чыноўнікі «саюздрукаў» прымалі рашэнне не пускаць у продаж газету з інфармацыяй пра «Хроснага Бацьку». Яны былі толькі выканаўцамі.

Уражвае інерцыйнасць мыслення работнікаў таямнічага органа, адказнага за забарону. Ужо хто-хто, а чытачы «НН» выдатна разумеюць сутнасць беларуска-расійскага канфлікту апошняга часу і ролю ў ім расійскіх СМІ. Якія 15 гадоў маўчалі, а тут раптам загаварылі праўду. Чытач «НН» нічога новага з таго фільма пра Лукашэнку не дазнаўся. Сюжэтам газетнага аналізу быў сам выхад фільма на газпромаўскім канале. №25 газеты даваў інфармацыю і аналіз падзей мінулага тыдня, як давала б яго любая нармальная газета ў свабоднай краіне.

Канфіскацыя тыражу «НН» стала, апроч іншага, праявай неадэкватнасці рэакцыі аўтарытарнага рэжыму на тыя выклікі, якія перад ім паўстаюць. Беларускае грамадства застаецца пад расійскім інфармацыйным уплывам, які фармуе грамадскую думку па асноўных пытаннях. Эканоміка застаецца залежнаю ад расійскай сыравіны. А лукашэнкаўцы вырашаюць праблемы, затыкаючы рот незалежным беларускім СМІ.

Мысленне ў такім ключы робіць дыялог улады з грамадствам немагчымым.

Што да нашых чытачоў, то выпадак з №25 нагадаў нам усім: самы надзейны спосаб атрымання «НН» — гэта падпіска праз Рэдакцыю.

**Рэд.**




Юлія Дарашкевіч

**Просім чытачоў: хто не атрымаў «НН» №25, звяртайцеся ў «саюздрукі»**

РУП «Белсаюздрук» (Мінск) 227–25–42
РУП «Мінаблсаюздрук» (Мінская вобласць) 237–33–67
РУП «Брэстаблсаюздрук» (0162) 21–98–38 (0162) 21–98–38
ААТ «Магілёўаблсаюздрук» (0222) 25–73–24 (0222) 25–73–24
РУП «Віцебскаблсаюздрук» (0212) 36–53–01 (0212) 36–53–01
РУП «Гомельаблсаюздрук» (0232) 74–35–88 (0232) 74–35–88
РУП «Гроднаблсаюздрук» (0152) 76–83–00 (0152) 76–83–00

## Літвіна: Гэта прыкмета цэнзуры

### Каментар старшыні Беларускай асацыяцыі журналістаў **Жанны Літвіной**.

Факт знікнення большай часткі накладу «Нашай Нівы» ёсць сумнай прыкметай ажыццяўлення цэнзуры ў Беларусі. Нягледзячы на тое, што гаворка ідзе пра дачыненні двух суб'ектаў гаспадарання, на якія так любяць спасылацца супрацоўнікі сістэм распаўсюджвання.

Тое, што цяпер адбываецца, пацвярджае, што вяртанне дзвюх газет у сістэмы «Белпошта» і «Саюздрук» было палітычным рашэннем. Якое, аднак, яшчэ не гарантуе, што гэтыя выданні будуць пазбаўленыя праблем з распаўсюдам».

## Сцісла

• **Лукашэнка сустракаўся з Саакашвілі?** Пра сустрэчу ў Крыме паведамляюць неафіцыйныя грузінскія крыніцы. Афіцыйна Лукашэнка браў удзел у нефармальным саміце СНД, які сабраўся з нагоды 60-годдзя Януковіча.

• **Праспект Дзяржынскага ў Мінску прапануецца пераназваць у гонар Вітаўта Вялікага.** Аргкамітэт па святкаванні 600-годдзя Грунвальдскай перамогі накіраваў зварот у Мінгарвыканкам з просьбай надаць мінскім вуліцы і плошчам гістарычныя назвы. У прыватнасці, праспекту Дзяржынскага прапануецца надаць імя Вітаўта Вялікага і караля Ягайлы. А плошчу Мяснікова ці Юбілейную пераназваць у плошчу Грунвальдскай перамогі.

• **Пяты танкер з венесуэльскай нафтай прыбудзе праз Эстонію.** З Адэсы нафту возяць на Мазырскі нафтаперапрацоўчы, з эстонскага порта Мууга — на «Нафтан». Між Адэсай і Мазыром — 1051 км, між Мууга і Наваполацкам — 850 км.

• **Балта-Чарнаморскі нафтаправод: вымалёўваецца перспектыва.** Першыя віцэ-прэм'еры Украіны і Беларусі Андрэй Клюеў і Уладзімір Сямашка падпісалі ў панядзелак у Кіеве пагадненне пра супрацу ў транспартаванні нафты. У 2010-м праз Украіну ў Беларусь маюць паставіць 4 млн т. У 2011-м — 10 млн. Ад 2011-га можа пачацца выкарыстанне нафтаправода Адэса-Броды для пампавання гэтых аб'ёмаў.

• **Тота Кутуньё заспяваў па-беларуску.** На «Славянскім базары» ў Віцебску выступіў кумір моладзі 70-80-х гадоў, італьянскі рамантык Тота Кутуньё. На сцэну паставілі крэсла, на якое 67-гадовы выканаўца часта сядаў, адпачываючы. А самым неверагодным сюрпрызам для гледачоў ад Тота Кутуньё стала вядомая песня з рэпертуару «Сяброў» — «А я лягу, прылягу», якую італьянец старанна праспяваў на беларускай мове, часам аддалена набліжаючыся да арыгінала.

• **Бой падушкамі.** Мінгарвыканкам адмовіў суполцы «Гісторыка» ў афіцыйным правядзенні мерапрыемства, прымеркаванага да 600-годдзя вялікай перамогі ў Грунвальдскай бітве, — папулярнай сярод моладзі «бітвы падушкамі» ля Нацыянальнай бібліятэкі. Ініцыятары ад сваёй ідэі ўсё адно не адмаўляцца. Яны запланавалі бой падушкамі на 15 ліпеня, 19.00. Удзельнікаў запрашалі прыходзіць са сваімі падушкамі.

**Сяргей Мікулевіч; naviny.by**

### Самае чытанае на nn.by за 7—13 ліпеня

- Наша Ніва» з інфармацыяй пра «Хроснага Бацьку»: тыраж знік
- Дзмітрый Лукашэнка супярэчыць бацьку + відэа
- Забаронены нумар «НН» можна прачытаць тут у ПДФ
- «Московский комсомолец» далучыўся да кампаніі дыскрэдытацыі Лукашэнкі
- Расійская шпіенка будзе судзіцца за свае інтымныя фоты
- Астапа панесла
- «Если не владеете русским, то советую заняться его изучением»
- «Вершы Бураўкіна — рыфмаванае пустазвонства, а творы Барадуліна — фальшыўка»
- Папулярнасць кандыдатаў у прэзідэнты. Вынікі чэрвеньскага апытання НІСЭПД
- Мілінкевіч у Гомелі: Расія паставіць на іншага чалавека

### nn@nn.by

«Сяброўка працуе ў тым месцы, дзе раздаюць газеты па кіёсках Мінска. Сапраўды, у сераду яна мне сказала, што наклад НН не пусцілі праз артыкул пра Л... Іх нават на працы затрымалі, пакуль вырашалася пытанне далейшага лёсу накладу. Газеты ў той час ляжалі ў іх... Дзе цяпер яны знаходзяцца, яна не ведае».

**Я**


# Дык падпісвайся!

## Падпіска праз Рэдакцыю

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае 7500 рублёў.

Мы рэкамендуем падпісвацца праз Рэдакцыю.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Каб штотыдзень атрымліваць газету, дасылайце адрасы і грошы за газету.

1) Просім усіх ахвотных падпісацца паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз: тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езда.

**Банкаўскія рэквізіты (змяніліся з 1 мая):**

ПВУП «Суродзічы», УНП 190 786 828

Аддз. № 539 ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Мінск, код 739

Рахунак атрымальніка: 3012 740 628 011

Від аплаты: За газету «Наша Ніва»

## Падпіска праз «Белпошту»

Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — 63125, для прадпрыемстваў — 631252. Падпісацца можна на кожнай пошце.

## Дзякуй падпісчыкам,

якія падпісваюцца праз Рэдакцыю

Васілю Н., Ганне К., Вользе Г., Яўгеніі К., А.Л. з Віцебска.
Сяргею Ц. з Докшыцкага раёна.
Т.К. з Магілёва.
Мікалаю К. з Валожынскага раёна.
Аляксандру А. з Нясвіжскага раёна.
Валерыю П., Уладзіміру Г. з Баранавіцкага раёна.
Паўлу Д. з Глыбоцкага раёна.
Ніне А. з Клімавіцкага раёна.
Мікалаю Х., Валянціну М., Алегу М., Цімафею Т., Сяргею І. з Гомеля.

# Еўропа ўсё заляцаецца

**Мінск з візітам наведаў еўракамісар па пытаннях пашырэння і еўрапейскай палітыцы добрасуседства Штэфан Фюле.**

Ён наступнік Беніты Ферэра-Вальднер, якая прыязджала ў Беларусь год таму. Пасля той паездкі ў аэрапорце было гучна абвешчана, што візіт еўракамісара стане новай вяхой у дачыненнях Еўропы і афіцыйнага Мінска. Прайшло ўжо больш за 12 месяцаў, а істотных зрухаў як не было, так і няма.

Найперш Фюле яшчэ ў чацвер меў сустрэчу з лідэрамі апазіцыі і грамадскімі лідэрамі. Спатканне адбывалася позна ўвечары ў гасцініцы «Еўропа». Прыкладна аб 11-й гадзіне супрацоўнікі гатэля казалі, што ўдзельнікі сустрэчы яшчэ ядуць дэсерт.

А ўжо ў пятніцу спадар Фюле сустракаўся з прадстаўнікамі ўлады. Апошнім жа пунктам візіту значылася прэс-канферэнцыя. «Чаму ўсе такія сур'ёзныя?» — адразу па-расійску пажартаваў **Штэфан Фюле (на фота)**. Разам з ім таксама з'явіліся паслы Літвы і Швецыі Эдмінас Багдонас і Стэфан Эрыксан.

Журналісты пацікавіліся ў еўрачыноўніка, якія ўражанні зрабіў на яго Аляксандр Лукашэнка. «Адзінае, што я скажу, — размова была вельмі шчырая. І не толькі пры ўключаных камерах, але і калі журналістаў папрасілі пакінуць памяшканне».

Напярэдадні лідэр Руху «За Свабоду» Аляксандр Мілінкевіч прасіў Фюле падняць на перамовах з беларускім лідэрам пытанне палітвязняў, у прыватнасці Мікалая Аўтуховіча. «Не буду пераказваць нашу размову, але гэтае пытанне некалькі разоў паўставала».

У Штэфана Фюле ўжо было некалькі падрыхтаваных пунктаў прамовы.

**Брусэль прапануе спрашчэнне візавага рэжыму для беларусаў.**

Па-першае, Беларусь і Еўрасаюз могуць рабіць больш у палітыцы добрасуседства і развіцця адносін. На думку Фюле, патэнцыял «Усходняга партнёрства» выкарыстоўваецца нашай краінай толькі на 10-20%. «Веру, што сітуацыя можа змяніцца, калі мы падтрымаем шлях рэформаў у Беларусі».

Па-другое, дыялог магчымы толькі пры выкананні базавых каштоўнасцяў дэмакратыі і правоў чалавека. І тут вызначальная роля будзе належаць прэзідэнцкім выбарам. «Выбары — гэта дэмакратычная пячатка на міжнародным пашпарце Беларусі», — адзначыў еўракамісар. Яшчэ было нагадана пра неабходнасць скасавання смяротнага пакарання.

Па-трэцяе, ужо сёння Еўрасаюз практычна распрацаваў так званую Дарожную мапу для рэформаў у Беларусі. Гэты дакумент называецца «супольны прамежкавы план». У верасні ці кастрычніку яго абмяркуюць лідэры краін ЕС.

Па-чацвёртае, у Брусэлі падрыхтаваная прапанова аб спрашчэнні візавага рэжыму для грамадзян Беларусі. Фюле спадзяецца, што працэс перамоваў пачнецца яшчэ сёлета.

Чэх кажа, што ў 2008 годзе Брусэль атрымаў ад Мінска шмат пазітыўных сігналаў наконт сітуацыі з правамі чалавека. «Паляпшэння цяпер няма, а калі нейкі рух ёсць, то назад», — зазначыў чыноўнік.

Ён запэўніў, што візіт не звязаны з пагаршэннем беларуска-расійскіх дачыненняў. «Мы прапануем Мінску розны тавар. Няма нічога кепскага ў пашыраных адносінах Беларусі і з Масквой, і з Брусэлем».

**Зміцер Панкавец**


Юлія Дарашкевіч

# Дзмітрый Лукашэнка супярэчыць бацьку

### Бацька сказаў

А.Лукашэнка: «Дзеці, сям'я — яны, калі ты дзяржаўны чалавек, павінны каля цябе на дзяржаўнай службе быць. Яны не могуць быць бізнэсоўцамі. Ну, уявіце, у мяне сын — бізнэсовец! Ну ясна, што паспяховым быў бы, так жа? І не трэба мне нікому тэлефанаваць, гаварыць і падтрымліваць. Прозвішча само за сябе будзе казаць. Ніякіх блізкіх сваякоў у бізнэсе быць не павінна. А пажадана, і далёкіх. Ні адзін чалавек у прэзідэнта Лукашэнкі — ні дзеці яго, блізкія родныя і далёкія — бізнэсам не займаецца. У нас, увогуле, і нельга, а ў вас (у Расіі) можна». (Бел. радыё 1-я пр. 2.10.2009)

### Сын сказаў

Дз.Лукашэнка: «У інтэрнэце і ў газетах праслізгвае інфармацыя, што прэзідэнцкі спортклуб шчодра фінансуецца з дзяржбюджэту. Я хачу сказаць адкрыта, што за гэтыя пяць гадоў не выдаткавана ніводнага рубля беларускага з дзяржбюджэту. І усё, што мы робім, усе мерапрыемствы, усе праекты, — гэта ўсё робіцца за кошт удзелу нашага клуба ў камерцыйных праектах. Мы выступаем заснавальнікам, гэта адкрыта, пра гэта паўсюль пісалі: і «Спорт-пари», як вы ведаеце, і ганддлёвы дом БЕЛАЗ, цяпер у нас на стадыі пачатковых работ гольфклуб, будзе надзвычайны комплекс пабудаваны каля кальцавой дарогі, «Нотынгем». Там і жыллё будзе, спартыўны складнік... Ну, вось дзякуючы гэтым праектам мы і жывем, існуем. Дзякуй, вядома, фундатарам». (АНТ, 6.07.2010)

### Газета пісала

«Прэзідэнцкі спортклуб удзельнічае ў 8 гаспадарчых праектах, сярод якіх — будаўнічая кампанія «ЮнивестСтройИнвест», дзве латарэі «Спорт-пари», «Першая ўзорная друкарня», жылы мікрараён «Нотынгем» і інш. («Камсамольская праўда ў Беларусі», 30.06.2010)

**Уладзімір Падгол**



# Збілі Артура Фінькевіча

Здарэнне адбылося 8 ліпеня ў раёне перасячэння праспекта Машэрава з вуліцай Чырвонай. Лідэр «Маладой Беларусі» Артур Фінькевіч разам з актывістам Аляксеем Лыкшыным зайшоў у двор.

Артур кажа, што літаральна праз імгненне на іх накінуліся ззаду чацвёра мужчын. «Людзі ў двары бачылі гэтых людзей і пры неабходнасці змогуць пазнаць», — кажа Фінькевіч.

Па словах Артура, яму ў вочы пырснулі нейкай шчыпкай вадкасцю. Кашуля пасля аказалася ў нечым ружовым.

У моладзевага лідэра забралі ноўтбук, дыктафон, некалькі флэшак, мабільнік. Адабралі таксама пашпарт з амерыканскай візай. У нядзелю Фінькевіч мусіў ляцець у Штаты. Натуральна, што без пашпарта нікуды не выехаў.

У суботу прайшоў з'езд «Маладой Беларусі». Артур не выключаў, што інцыдэнт са збіццём мог быць звязаны з правядзеннем з'езда. На сходзе сябры «Маладой Беларусі» падтрымалі Аляксандра Мілінкевіча як кандыдата ў прэзідэнты.

Па справе збіцця Савецкім РУУС заведзеная крымінальная справа.

**ЗП**

### Сцісла

• **Крымінальная справа супраць Тарэсы Собаль спыненая «за адсутнасцю ў яе дзеяннях складу злачынства».** Следства падазравала старшыню Івянецкага аддзела непрызнанага ўладамі Саюза палякаў Беларусі ў «злоўжыванні службовым становішчам». На думку актывістаў, гэта было палітычнае запалохванне.

• **Узгоднены план святкавання 27 ліпеня.** Вулічнае мерапрыемства пачнецца а 18-й на плошчы Якуба Коласа. Далей удзельнікі рушаць да сквера Янкі Купалы і помніка Максіму Багдановічу. Паводле задумы, у той жа дзень аднагодкі Дэкларацыі, юнакі 1990 году нараджэння, павіншуюць з гэтым святам былых дэпутатаў, якія Дэкларацыю распрацоўвалі. Дэкларацыя азначала падрыхтоўку да выхаду Беларусі з Савецкага Саюза. Як толькі склаліся спрыяльныя вонкавыя ўмовы, 25 жніўня 1991 Дэкларацыя набыла статус канстытуцыйнага закону.

• **Прэм'ер-міністр Літвы мяркуе, што Беларусь адмовіцца ад АЭС.** «Я думаю, што мы маглі б пераканаць іх у тым, што будаваць атамную электрастанцыю ля мяжы з Літвой неразумна. Але гэта пытанне далёкай будучыні», — сказаў Андрус Кубіліюс.

• **Актывісты КХП-БНФ зладзілі пікет супраць Мытнага саюза.** Пікет быў праведзены ў Мінску каля Камароўскага рынку. Пікетоўцы трымалі ў руках плакаты: «Не — мытнаму саюзу з Расіяй і Казахстанам!», «Альтэрнатыва мытнаму саюзу — эканамічная рэформа і разварот да народа!» і «Рэжым у адстаўку!»

• **Змена рэжыму Лукашэнкі спадабаецца ўсім.** «Брусэль і Масква нячаста сыходзяцца ў поглядах, аднак цяпер яны хочуць, каб Аляксандр Лукашэнка сышоў. Прычым пажадана пасля прызначаных на пачатак 2011 году выбараў», — напісаў амерыканскі часопіс «Newsweek».

• **Астапа панесла.** У сваёй калонцы на сайце naviny.by кіраўнік лукашэнкаўскага тэлебачання Аляксандр Зімоўскі надзвычай эмацыйна выказаўся аб інфармацыйнай вайне, усчатай расійскімі СМІ супраць Лукашэнкі. «Па-за Беларуссю сінявокай вераломны пінок расійскіх СМІ па крышталёвым сасудзе быў сустрэты з непрыхаванай зларадасцю. Also, МЗС прас...аў момант, калі ЗША і РФ знюхаліся па беларускай праблематыцы. Страху ў гэтым няма, вобраз ворага можна кляпаць яшчэ больш моцна, груба і бачна. Але дзе, б..., разведдадзеныя?! Разведдадзеныя, я вас пытаю, дзе, б...!!??», — грыміць Зімоўскі.

**Юльян Місюкевіч, ЗП**

ТЭЛЕВІЗАР

# «Чырвоны і зялёны не спалучаюцца»

Рэклама бяскрыўдных цукерак M&M's з такім слоганам круціцца на БТ. Маладафронтавец, напісаўшы такое на плоце ўначы, атрымаў бы штраф як мінімум. Куды толькі глядзяць акадэмік Рубінаў і сенатар Чаргінец? Чаму не бароняць дзяржаўнасць і маральнасць?

**Сяргей Мікулевіч**



# Бізнэс-імперыя прэзідэнта

Працяг са старонкі 1.

### Адпачынак пасля доўгай, напружанай працы

Кіраўніцтва справаў прыбрала да рук санаторыі за межамі краіны, якія дасталіся ў спадчыну ад БССР. Туапсэ, Друскенікі, Ялта, Сочы, Юрмала... Гаворка аб іх продажы не заводзілася нават у часы самай нястачы. Пра санаторыі і дамы адпачынку ўнутры Беларусі і казаць не варта. «Юнацтва», «Баравое», «Сосны» — раней сюды ездзілі лячыцца па дармовых пуцёўках прафсаюзнікі, цяпер — стомленыя ад турэцкіх і егіпецкіх пляжаў расіяне.

Турыстычны аператар «Цэнтр-Курорт» вызначае, ці выдзеліць ахвотным пуцёўкі ў пералічаныя вышэй санаторыі. Таксама арганізацыя валодае больш за дзесяццю аптэкамі ў сталіцы.

РУП «Беларускія латарэі» застаецца найбуйнейшым гульцом латарэйнага бізнэсу, прапануючы дваццаць гульняў. Галоўны брэнд «Ваша лато» працягвае змаганне з «Суперлато» Дзмітрыя Лукашэнкі, але ў кампаніі ёсць яшчэ іншыя гульні, і тыражныя, і імгненныя.

### Нацыянальныя прэзідэнцкія паркі

У краіне налічваецца пяць нацыянальных паркаў — «Белавежская пушча», «Нарачанскі», «Прыпяцкі», «Бярэзінскі» і «Браслаўскія азёры». Усе гэтыя ўнікальныя прыродныя аб'екты ў сярэдзіне 90-х трапілі пад кантроль КСП. Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка любіць паўтараць, што паркі былі перададзеныя Кіраўніцтву справаў своечасова. Маўляў, толькі так удалося захаваць іх у першасным чыстым выглядзе.

Так ці не, але карупцыя у парках квітнее. З таго часу колькасць арыштаваных кіраўнікоў паркаў пастаянна расце. У адным толькі Браслаўскім нацпарку трое прызначаных дырэктароў па чарзе ішлі пад суд. Усіх іх — прызначаных асабіста прэзідэнтам — абвінавачвалі ў перавышэнні службовых паўнамоцтваў. План па вырубцы ў Белавежскай пушчы, адстрэл зуброў — усё гэта таксама факты апошніх гадоў.

### «Прэзідэнт-гатэль». У гасцях у прэзідэнта

На цяперашні момант КСП валодае трыма сталічнымі гатэлямі. Самы прэстыжны — чатырохзоркавы «Мінск», які стаіць на самой плошчы Незалежнасці. «Планета» і «Юбілейная» маюць «усяго» тры зоркі, дый знаходзяцца далей ад цэнтра. Кампенсаваць недахоп зорнасці мусіць «Прэзідэнт-гатэль», які ўзводзіцца ўдарнымі тэмпамі ў суседнім квартале з рэзідэнцыяй кіраўніка дзяржавы. З іншага боку ад яго размяшчаецца «лечкамісія» — элітная бальніца на чале з Ірынай Абельскай.

...Будаўнічыя трэсты, эксперыментальныя калгасы, гандлёвыя цэнтры — вось няпоўны спіс таго, што засталося па-за нашай увагай. А ёсць жа яшчэ і Дэпартамент па гуманітарнай дзейнасці, які вырашае, ці мае права патраціць якія-кольвечы грашовыя пераводы з-за мяжы...

А якія прыбыткі прыносяць офісныя будынкі па ўсім Мінску, якія Кіраўніцтва справаў у свой час забрала сабе амаль у поўным складзе. Есці не просяць, а арэнду прыносяць.

Для параўнання, пад кантролем упраўлення справамі прэзідэнта Украіны налічваецца 50 арганізацый. У агромністай Расіі — 105 арганізацый, але дзясятак з іх — гэта дзіцячыя садкі.

Сапраўдныя гандлёвыя абароты беларускай бізнэс-імперыі ніколі не абнародваліся. Па сведчаннях былога заўхоза Івана Ціцянкова, нават у яго часы, у канцы 90-х, прыбыткі ішлі на мільярды даляраў.

**Віталь Несцераў**



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Прэзідэнцкія «заўхозы»**

**Іван Ціцянкоў** 1994—1999 — уцёк у Расію

**Уладзімір Ганчарэнка** 1999—2001 — былы міністр сувязі

**Галіна Жураўкова** 2001—2004, была асуджаная судом, але памілаваная прэзідэнтам

**Генадзь Лаўранкоў** 2004—2005

**Аляксандр Кулічкоў** 2005—2008 — былы міністр гандлю

**Мікалай Дамашкевіч** 2008—2009 — былы кіраўнік Міншчыны

**Мікалай Корбут** 2009 — былы міністр фінансаў

**Што яшчэ?**

- Гарналыжны цэнтр «Сілічы»
- Рэстаран «Лідо»
- НВЦ «Белэкспа»
- Палац Рэспублікі
- Дом друку

## Лукашэнка: У краіне зашмат новабудоўляў

### Кіраўнік дзяржавы нібы папярэдзіў пра будучае запавольванне эканомікі.

«У краіне неабходна скарачаць колькасць залішніх новабудоўляў і аб'ектаў, якія не з'яўляюцца жыццёва неабходнымі», заявіў Аляксандр Лукашэнка ў часе паездкі ў Віцебскую вобласць.

Кіраўнік дзяржавы нібы папярэдзіў пра будучае запавольванне эканомікі. Менавіта да яго прывядзе скарачэнне дзяржаўных інвестыцый у будаўніцтва. Яно было рухавіком, які ўтрымаў беларускую эканоміку ад крызіснага падзення. Тэмпы росту інвестыцый апошняе дзесяцігоддзе складалі стабільна больш за 20% у год. Сацыяльнае будаўніцтва было адным з галоўных кірункаў дзяржаўнага інвеставання.

Паводле словаў Лукашэнкі, у свой час былі шырока разгорнутыя маштабныя праекты і ўведзена досыць адукацыйных, медыцынскіх і іншых установаў. У наступным годзе будуць узводзіцца «толькі тыя аб'екты, якія сапраўды неабходныя».

«Нам трэба сёлета паскорыцца, а ў будучыні — завяршыць будаўніцтва ўсіх сацыяльных аб'ектаў», — сказаў Лукашэнка. Паводле яго словаў, больш сродкаў будзе ўкладацца ў праекты, якія хутка акупляюцца.

Тэма новабудоўляў паўстала ў часе абмеркавання прапановаў Віцебскага аблвыканкама па будаўніцтве, рэканструкцыі і рамонце аб'ектаў Віцебска.

Аляксандр Лукашэнка і ў мінулым паслядоўна рыхтаваў грамадскую думку да непапулярных крокаў: ліквідацыі льготаў ці пабудовы АЭС.

**Мікола Бугай**

## Абмен расійскай валюты — толькі па пашпарце?

### Вялікія сумы расійскіх рублёў апынуліся па-за законам.

Беларусы, якія спрабавалі апошнімі днямі абмяняць расійскую валюту ў мінскіх абменніках, былі непрыемна здзіўленыя. Калі яны працягвалі ў акенца купюры, аператар пункта патрабавала ў іх пашпарт.

Па словах касіраў, некалькі тыдняў таму беларускае МУС разаслала па банках указанне — патрабаваць з грамадзян, якія мяняюць вялікія сумы расійскіх рублёў, пашпарт з фіксацыяй дадзеных адтуль. Прычым распараджэнне датычыць менавіта расійскай валюты. Ні на дзвярах ці ўваходзе ў абменны пункт, ні на акенцы ніякіх паведамленняў, пры гэтым, не вісіць.

У прэс-службе Нацыянальнага банка паведамілі, што нічога не ведаюць пра такое ўказанне МУСа. «Калі яно і было, то спачатку трапіла б у Нацбанк, якому падпарадкоўваюцца астатнія банкі», — кажуць у галоўным банку краіны. А таму, маўляў, дзеянні касіра — звычайная самадзейнасць.

Як паведаміў супрацоўнік аднаго са сталічных банкаў, размешчаных у элітным гатэлі, ён атрымаў яшчэ больш жорсткае ўказанне. Па інструкцыі, убачыўшы вялікую суму расійскіх рублёў, ён мусіў «незаўважна націснуць гузік трывогі і чакаць супрацоўнікаў міліцыі». «Мяжа вялікіх грошай» складае 5000 расійкіх рублёў. Гэта каля 500 тысяч беларускіх рублёў.

Па некаторых звестках, такім чынам міліцыя нібыта хацела выявіць грошы, захопленыя ў час рабавання банка «Масква—Мінск».

**Кастусь Матушыч**

## Золатавалютныя рэзервы працягнулі свабоднае падзенне

### Гэта вымушае ўлады або прыватызаваць адно з буйных прадпрыемстваў, або дабіцца чарговага крэдыту МВФ.

Рэзервы знізіліся ў чэрвені больш чым на $ 250 млн. Калі б не дзяржкрэдыт Азербайджана, падзенне было б на яшчэ $200 млн большым.

Міжнародныя рэзервовыя актывы Беларусі, разлічаныя па стандартах МВФ, на 1 ліпеня 2010 склалі $5524 мільёны. За чэрвень яны знізіліся на $254 мільёны (4,4%).

Амаль такі самы памер зніжэння быў зафіксаваны і ў маі. Гэта азначае, што краіна вывозіць тавараў і паслуг менш, чым увозіць. Каб кампенсаваць такі дэфіцыт, краіна будзе вымушана або пазычаць на замежным рынку, або прадаць нешта з дзяржаўнай маёмасці. Гаворка вялася пра акцыянаванне «Беларуськалія».

Інакш далейшае скарачэнне рэзерваў можа прывесці да панікі на фінансавым рынку, падзення даверу да рубля.

**Мікола Бугай**

## МВФ: даляр будзе зніжацца на працягу 5 гадоў

### Маецца на ўвазе: адносна юаня і еўра, не беларускага рубля.

Міжнародны валютны фонд чакае, што курс даляра будзе ўмерана зніжацца на працягу 5 гадоў. Такі пункт гледжання мае намеснік дырэктара аналітычнага аддзела арганізацыі Дэвід Робінсан.

«Што тычыцца часовага прамежку ў 5 гадоў, грунтуючыся на цяперашніх паказчыках, мы можам чакаць некаторага паслаблення даляра», — адзначыў Робінсан.

Па ацэнках эканаміста, курс даляра хутчэй за ўсё знізіцца ўмерана.

Пры гэтым Робінсан звярнуў увагу на тое, што ў апошнія месяцы даляр у дачыненні да еўра «ацэньваўся дастаткова высока», аднак значна больш умерана — у адносінах да валютнага кошыка. Па словах эканаміста МВФ, нягледзячы на тое, што рост даляра не падтрымаў аднаўленне агульнасусветнай эканомікі, ён яму і не перашкодзіў.

**ЯВ**

## Сцісла

- **У Мінску пачалося будаўніцтва гатэля для жывёл.** Ён будзе знаходзіцца па адрасе Гурскага, 42. Плануецца, што будаўніцтва гатэля зойме два гады. Ён будзе разлічаны на 72 месцы: 36 — для сабак і столькі ж для катоў. Асабліва патрабавальныя гаспадары пры выездзе на адпачынак змогуць размясціць сваіх гадаванцаў у нумары люкс: па тры для катоў і сабак.

- **Змяніліся правілы ўвозу тавараў асабістага карыстання.** Ад 6 ліпеня без мытаў, можна будзе правезці маёмасць вагой, не большай за 50 кг і коштам 1500 еўра. Змянілася і норма алкагольных напояў для асабістага ўжывання. Яна павялічылася да 3 літраў, у тым ліку піва. Раней норма складала 2 літры на аднаго чалавека, і гэта тычылася толькі моцных напояў.

- **Стаўка рэфінансавання — 11,5%.** Апошні раз зніжэнне адбылося 12 мая — таксама на 0,5%. Стаўка рэфінансавання ўплывае на працэнты па крэдытах і дэпазітах. Да канца году прадугледжваецца зніжэнне стаўкі да 9-12% гадавых, а ставак па крэдытах — да 12-15% гадавых.

- **Па суседстве з Лошыцкім паркам з'явіцца чатырохзоркавы гатэль.** Яго асновай стануць старадаўнія будынкі былога бровара. На першым паверсе прапануецца размясціць піваварны цэх з піўным рэстаранам. Будаўніцтва пачнецца ў 2011-м.

- **«Газпром» стаў самай прыбытковай кампаніяй у свеце.** Летась чысты прыбытак «Газпрома» склаў $24,56 мільярда, прытым што даход кампаніі знізіўся на 17,8%. Лідэрам яшчэ па адной пазіцыі — памеры агульных фінансавых паступленняў — аказалася найбуйнейшая ў свеце сетка супермаркетаў рознічнага гандлю Wall-Mart. Летась кампанія прынесла сваім уладальнікам $408 мільярдаў.

**ЯВ**

# «Цыбульная рэканструкцыя» не спыняецца

**Нягледзячы на прадпісанне Міністэрства культуры, працы на старажытнай Барысаглебскай царкве ў Навагрудку працягваюцца.**

Нагадаем, мясцовы святар Мікалай Орса вырашыў «упрыгожыць» гатычны храм XVI ст. расійскімі купаламі-цыбулінамі. У беларускай жа традыцыі праваслаўя ніякіх «цыбулін» над цэрквамі не было. Яны пачалі з'яўляцца толькі ў XIX ст., разам з русіфікацыяй.

Пасля публікацый у «НН» (№24 і 25) рэканструкцыя афіцыйна была спыненая. Тым не менш, праца на месцы не спыняецца. У суботу, 10 ліпеня, рабочыя працягвалі завіхацца каля купалоў **(на фота)**, што стаяць у двары царквы. Работа не спынялася нават у самы сквар.

Аб тым, што прадпісанні Мінкульта ініцыятараў «цыбулізацыі» не палохаюць, сведчыць акцыя «Імёны пад нябёсамі». Абвестка на дзвярах храма заклікае ахвяраваць на купалы. «Імёны ахвярадаўцаў будуць змешчаныя ў памятную капсулу пад купалам царквы», — гаворыцца ў абвестцы.

Падобна, бацюшка пайшоў на прынцып. Якой будзе рэакцыя Паўла Латушкі?

**Зміцер Панкавец, Навагрудак — Мінск**



ЗМІЦЕР ПАНКАВЕЦ

# Вершы Бураўкіна — «рыфмаванае пустазвонства», а творы Барадуліна — «фальшыўка»

**На сайце Саюза пісьменнікаў Беларусі паэт Валерый Грышкавец надрукаваў артыкул «А я веру Чаргінцу…»**

Аўтар называе вершы Бураўкіна рыфмаваным пустазвонствам, а творы Барадуліна — фальшыўкай.

Найстарэйшая беларуская літаратарка Лідзія Арабей надрукавала ў «Дзеяслове» свае абразкі «Перабежчыкі». У ім яна піша: «Хочацца спытаць у тых, што перабеглі з нашага саюза да Чаргінца: — А вы не баіцеся, што некалі вам скажуць: «Все вы хрюкали возле моего корыта...» Альбо: — Я вас нашел на помойке...»

Сп. Грышкавец адным сваім адказам ёй здолеў абразіць дзясятак літаратараў.

«Для мяне яны даўным-даўно ніякія не аўтарытэты, а так, рвачы ад літаратуры». «Тады гэтыя «класікі» [Барадулін, Бураўкін — КМ] ... кляліся ў вернасці Леніну і партыі, сёння адзін казырае тым, што цалаваў ручку папу Яну, а другі ўсё прысягае на вернасць народу і «мове» — акурат як зусім нядаўна Леніну і партыі...»

«А можа, спецыяльна тое робяць, каб канчаткова адбіць у людзей ахвоту да «роднай мовы»?» — пытаецца Грышкавец.

У сваю чаргу, Грышкавец усхваляе Мікалая Чаргінца. Ставіць у прыклад тое, што генерал ваяваў у Афганістане, мае ўзнагароды, захоўваў вернасць Савецкаму Саюзу, а цяпер РБ. «Бураўкіна ці таго ж Барадуліна хрэна хто выжыў з цёплых кабінетаў — сядзелі і пасля пенсійных 60. Ні ў якія Афганы яны не тое што не збіраліся, іх туды калом не загнаў бы!»



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Эмоцыі сп. Грышкаўца зашкальваюць.

«Літаральна ўсё, што чытаў напісанае Бураўкіным за апошнія 20 гадоў, — не больш чым рафмаванае пустазвонства, пісьмо дзеля пісьма: сеў, прыдумаў, напісаў, надрукаваў-выдаў — задаволіў сваё самалюбства».

«На мой погляд, апошняя кніга Барадуліна «Ксты» — не больш чым шматстаронкавая, на хуткую руку зарыфмаваная фальшыўка...»

Артыкул быў напісаны яшчэ тры гады таму. Прыводзіцца факт, што ў 2007-м яго адмовіліся надрукаваць «ЛіМ», «Рэспубліка», «Народная воля», «7 дней», «Нёман» і «Беларуская думка». Гэта паказвае, што ў грамадстве здаровы глузд і элементарная пачціваць усё ж пераважаюць. Але не ва ўсіх.

**Кастусь Матушыч**

ЧЫТАЧ УЗНЯЎ ПРАБЛЕМУ

## Помнік Багушэвічу знішчаны? Не, ідзе рэканструкцыя

На выходных у Рэдакцыю НН напісаў чытач. Вандравалі па паўночным захадзе. Бачылі дзікасць: з магілы Францішка Багушэвіча ў Жупранах знік помнік. Магіла нагадвае месца атакі вандалаў. Што такое? Разбярыцеся.

Год жа юбілейны — 170 гадоў з нараджэння, 110 гадоў ад часу смерці чалавека, які замацаваў за беларусамі саманазву «беларусы».

Чытач прыслаў і фота разбуранай магілы.

Сталі мы разбірацца, якія дакладна працы будуць праводзіцца: рэстаўрацыя, рэканструкцыя ці замена пастамента, на якім знаходзіўся барэльеф.

У аддзеле культуры Ашмянскага райвыканкама, як аказалася, толькі адзін чалавек валодае поўнай інфармацыяй. Але ён адмовіўся штонебудзь расказваць, спаслаўшыся на тое, што знаходзіцца ў Мінску на курсах. І да вяртання ў Ашмяны



размаўляць па працоўных пытаннях не збіраецца.

Во зашуганыя нашы чыноўнікі! Што такога, здавалася б, адказаць на простае пытанне?

Нічога не ведалі аб працах у Жупранах і ў музеі Багушэвіча ў Кушлянах.

Між тым з 2003 помнік унесены ў Дзяржаўны спіс гістарычна-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь.

Аднак літаральна праз некалькі гадзін пасля публікацыі матэрыялу на сайце НН быў дасланы адказ з Ашмянскага райвыканкама:

«Паважаныя аўтары ліста, наведнікі сайта. Нам вельмі прыемна, што вы выказалі сваю занепакоенасць з нагоды помніка Багушэвічу.

У юбілейны год паэта аддзел культуры Ашмянскага райвыканкама запланаваў працы па замене помніка Багушэвічу.

За кошт спонсарскай дапамогі выраблены помнік з гранітнага камня з захаваннем усіх канструкцыйных рысаў, які ў найбліжэйшы час будзе ўсталяваны.

На здымку акурат і паказаныя працы па іх замене».

Што ж, прыемна чуць. І прыемна, што ёсць у краіне такія спонсары.

**КМ**

**Францішак Багушэвіч** (1840—1900). Адзін з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры. Нарадзіўся ў фальварку Свіраны. Удзельнік паўстання 1863—1864 гадоў. Пад псеўданімамі надрукаваў зборнікі вершаў «Дудка беларуская», «Смык беларускі». З 1898 жыў у Кушлянах (Смаргоншчына), пахаваны ў Жупранах (Ашмяншчына) на высокай гары тамтэйшых могілак, каля касцёла. Яму належаць словы: «Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі».

## Здарэнні сціслa

• **Прыехаў у Брэст купляць машыну, а знайшлі труп.** Расчлененны труп знойдзены ў Брэсцкім раёне. Парэшткі былі закапаныя ў зямлю паблізу вёскі Ваўкі. 15 мая гэты мужчына выехаў у Брэст, каб купіць там аўтамабіль, і знік. У яго былі пры сабе вялікія грошы. У забойстве падазраюць аднаго берасцейца. Ён затрыманы.

• **У маршрутцы ад задухі памёр расіец.** Жыхар Санкт-Пецярбурга 1951 года нар. памёр у маршрутным таксі Полацк—Мінск. Прычынай смерці стала вострая сардэчная недастатковасць. Мужчына гасцяваў у Беларусі.

• **Пагражаў кіроўцу пісталетам.** Інспектары ДАІ адабралі ў Мінску ў 21-гадовага жыхара Бабруйска пісталет і патроны. Той на стаянцы ля гіпермаркета «Гіпа» сеў у БМВ і стаў пагражаць кіроўцу пісталетам Макарава. Кіроўца пачаў супраціўляцца. Супрацоўнікі ДАІ, якія знаходзіліся побач, затрымалі нападніка.

• **Гродзенец давёў прафпрыдатнасць, узламаўшы сайт.** За ўзлом сайта Гродзенскага дзяржуніверсітэта 19-гадовы хакер заплаціць штраф у памеры больш за Br4,5 млн. Матыў злачынства аказаўся незвычайным: юнак вырашыў даказаць сістэмным адміністратарам сваю высокую кваліфікацыю.

• **Турак арганізоўваў сэкс-туры ў Беларусь.** Ён быў звязаны з адной з турфірмаў. На здымных кватэрах, а таксама ў нумарах дарагіх гатэляў ладзіў сустрэчы з мінскімі путанамі. Цана для кліентаў складала, як правіла, каля $150 за гадзіну. Турэцкі грамадзянін атрымліваў $ 50—80 «камісійных». Большая частка яго кліентаў — госці з Турцыі. Суд даў яму сем гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй.

• **Чэмпіянат стартаваў, а на дне — тапелец.** Падчас чэмпіянату сярод вадалазаў-ратавальнікаў МНС на дне возера ў Жлобінскім раёне быў знойдзены тапелец. Мужчына, жыхар вёскі Саланое Жлобінскага раёна, знік падчас рыбалкі 3 чэрвеня. Ён выпаў з лодкі, але тады пошукі цела не далі вынікаў.

• **Міліцыянт параніў дзяўчыну з пісталета.** У вёсцы Доўск Рагачоўскага раёна ўчастковы ў службовым аўтамабілі стрэлам з табельнай зброі цяжка параніў 22-гадовую мясцовую жыхарку. Пацярпелая ў бальніцы, яе стан крытычны. Паводле МУС, стрэл адбыўся выпадкова.

• **Януковіч сеў на 23 гады.** Тры крымінальныя аўтарытэты Пастаўшчыны — Міхаіл Януковіч і яго саўдзельнікі Алег Зубкевіч і Андрэй Лук'янаў — асуджаныя за забойства двух раней судзімых жыхароў Паставаў. Януковіч і Зубкоў атрымалі па 23 гады пазбаўлення волі, Лук'янаў — 13 гадоў. Забойства было ўчыненае ў 2007 падчас крымінальнага разбору. Целы злачынцы закапалі ў лесе ля вёскі Навасёлкі-2 Пастаўскага раёна. Банда Януковіча займалася вымаганнем, махлярствам, рабаўніцтвам.

# Каралеўскі фінал



**Упершыню ў фінале чэмпіянату свету па футболе сустрэліся дзве манархіі — Іспанія і Нідэрланды.**

На трыбунах у Ёханэсбургу прысутнічалі каралева Іспаніі Сафія, прынц Філіпэ і яго жонка Летысія, прынц Нідэрландаў Вільгельм-Аляксандр і прынцэса Максіма. Нікому не хацелася зганьбавацца перад такімі гледачамі.

Тым больш і тыя, і другія сусветнае першынства не выйгравалі ні разу. Таму ў Паўднёва-Афрыканскай Рэспубліцы непазбежна павінен быў стаць вядомы новы, восьмы чэмпіён свету.

Нідэрландцы прайшлі турнір без ніводнай паразы і нічыёй. Шэсць перамог у шасці матчах. Выдатны паказчык. А вось пірынейцы ў першай гульні саступілі швейцарцам. Яшчэ не было такога, каб каманда, што прайграе ў першай сустрэчы, выйгравала першынства. А ў плэй-оф атрымалі тры перамогі запар з мінімальным лікам 1:0.

Гэта нібы пра іх легендарны нідэрландзец Ёхан Круіф сказаў, што фіналы не гуляюцца, у фіналах перамагаюць. Сам Круіф свой фінал у 1974 годзе прайграў.

Гульня іспанцаў вылучалася жалезабетоннай абаронай. За ўвесь паўфінал з немцамі яны дазволілі суперніку стварыць толькі адзін момант ля сваіх варот. А калі наперадзе ладзілася ў Вілы, то пераможцу прадказаць было няцяжка.

Гульню даверылі абслугоўваць англічаніну Говарду Уэбу. Ён стаў самым маладым арбітрам, які судзіў фіналы мундыяляў за апошнія 44 гады. Уэб стаў адным з найбольш заўважных персанажаў сустрэчы.

Матч выйшаў грубы. Нідэрландцы ў ПАР былі адной з найбольш недысцыплінаваных каманд. Іспанцы ж, наадварот, у шасці папярэдніх сустрэчах заслужылі толькі тры папярэджанні.

«Аранжавыя» з першых хвілін паказалі, што займацца балетам не будуць. Іспанцаў білі бязлітасна па ўсіх частках цела. Быў бы тое не фінал, дык да выдалення нідэрландцы дагуляліся б значна хутчэй.

Пірынейцы таксама давалі бой. На кожны ўдар стараліся адказаць сваім. Часам відовішча больш нагадвала хакей. А можа, вызвольнае паўстанне нідэрландцаў за незалежнасць ад Іспаніі ў 1581 годзе. Толькі правадыром краіны цюльпанаў быў не Вільгельм Аранскі, а Ар'ен Робэн.

Уэб паказваў жоўтыя карткі адну за адной. Агулам іх было трынаццаць (восем атрымалі нідэрландцы, пяць — іспанцы). Рэкорд фіналаў.

Тым не менш, нават пры такой агрэсіўнай гульні каманды ўмудраліся стварыць нямала небяспечных момантаў. Як ля адных, так і ля другіх варот. Стараліся брамнікі. Напэўна, у Снайдэра і Касільяса ўсё жыццё пранеслася перад вачыма, калі другі ліквідоўваў булітны выхад першага.

Асноўны час скончыўся ўнічыю. У дадатковы ж нідэрландцы былі ўжо згодныя дацягнуць да серыі пенальці, але ў іспанцаў было сваё меркаванне.

За 11 хвілін да фінальнага свістка Уэб выдаляе нідэрландца Хейтынгу, а праз сем хвілін Іньеста прыносіць перамогу іспанцам. Без сумневаў, гэта быў самы важны гол у ягоным жыцці. Іньеста на радасцях здзер з сябе майку, за што таксама атрымаў «гарчычнік». Зрэшты, ён ужо не мог сапсаваць настрою.

На святочнай цырымоніі ў іспанцаў ужо не заставалася сілаў для радасці, усё было аддадзена для перамогі. На ўзнагароджанне іспанцы выйшлі ў загадзя падрыхтаваных чырвоных майках з зорачкай як чэмпіёны свету. Яны рыхтаваліся да гэтага выйгрышу. Нідэрландцы ў трэці раз гулялі ў фінале сусветнага чэмпіянату. І трэці раз саступілі.

Раней імідж галоўных футбольных няўдачнікаў належаў менавіта іспанцам. Апошнія чэмпіянаты Еўропы і свету зламалі гэты стэрэатып.

«Гэта было цудоўна, проста цудоўна», — не спынялася паўтараць пасля сустрэчы каралева Сафія.

**Зміцер Панкавец**

# Качавача Фарлан

**Найлепшым футбалістам чэмпіянату свету названы ўругвайскі форвард Дыега Фарлан. Ён апярэдзіў іспанца Давіда Вілью, нідэрландца Уэслі Снэйдэра, а таксама немца Томаса Мюлера.**



Фарлан мае мянушку Качавача — гэта вядзьмарка з папулярнага аргенцінскага мультсерыялу. Вядзьмарка марыць нарабіць шкоды жыхарам блізкага горада, але пры гэтым час ад часу якраз і выратоўвае гэтых жыхароў ад небяспечных зладзеяў.

Качавача — хутчэй пазітыўная гераіня, хоць і стараецца быць адмоўнай. Яна трапляе ў розныя недарэчныя гісторыі, а ў яе мятле няма тармазоў. За вонкавае і ўнутранае падабенства Фарлан і атрымаў такую мянушку.

А яшчэ за сугучнасць з прозвішчам яго звалі Forlorn (няшчасны). Гэта ў час ягонага знаходжання ў «Манчэстэр Юнайтэд». Там уругваец так і не стаў сваім, не прыжыўся. Затое як толькі ён пераехаў у Іспанію, у родную моўную і блізкую культурна прастору, як ягоная гульня зноў пачала вылучацца філіграннасцю.

Фарлан з футбольнай сям'і. Ягоны бацька Пабла быў удзельнікам двух чэмпіянатаў свету ў складзе Уругвая. А дзед па матчынай лініі, аргенцінец Хуан Карлас Караса, гуляў за «Індэпэнд'ентэ».

Тым не менш, Фарлан-малодшы першапачаткова пачынаў займацца тэнісам, а не футболам. Зрэшты, дазволіць сабе прафесійна расці ў тэнісе могуць толькі забяспечаныя сем'і. Радзіна Фарлана ніколі не адносілася да такіх, а тут яшчэ здарылася трагедыя.

У 1991 годзе сястра Дыега Алехандра трапіла ў жудасную аўтакатастрофу. Яе бойфрэнд загінуў на месцы, а дзяўчына выжыла, але на яе лячэнне спатрэбіліся вялікія грошы. У сям'і такіх не было.

Лячэнне Алехандры ўзяў на сябе... Дыега Марадона, добры сябра бацькі Фарлана.

«Ён сказаў мне, што стане вялікім футбалістам, каб зарабіць грошай і вылечыць мяне», — кажа Алехандра. Яна так і не адужала канчаткова, дактары былі бяссільныя нешта зрабіць. Хутчэй за ўсё, астатак жыцця яна правядзе ў інвалідным вазку. Але гэта не стала для яе перашкодай, каб наведаць чэмпіянат у ПАР.

Фарлан ніколі не гуляў за прафесійныя ўругвайскія каманды. Як толькі ён пачаў падаваць надзеі, Марадона «ўладкаваў» яго ў аргенцінскі клуб «Індэпэнд'ентэ» — той самы, дзе гуляў дзед Фарлана.

Потым быў пераход у «Манчэстэр Юнайтэд», які канчаткова вырашыў фінансавыя праблемы ў сям'і. Цяпер Дыега — гулец мадрыдскага «Атлетыка». У 102 гульнях за клуб гэты 190-сантыметровы форвард закалаціў 66 галоў. Выдатны паказчык.

Сёлета ягоны клуб выйграў Лігу Еўропы. Фарлан быў прызнаны найлепшым гульцом фіналу. А цяпер новае прызнанне.

На мундыялі Фарлан гуляў прыгожа і лёгка. На ягоным рахунку пяць мячоў. Гэта дазволіла ягонай краіне нечакана выйсці ў чацвёрку наймацнейшых камандаў планеты. І без усялякага чараўства.

Гэта год качавачы Фарлана. Дарэчы, Марадона ўладкаваў не толькі футбольнае, але і асабістае жыццё форварда. Менавіта ён пазнаёміў уругвайца з прыгажуняй Заірай Нарай, якая і стала жонкай футбаліста.

**ЗП**

# Васьміногі аракул

**Здаецца, гэта поўнае вар'яцтва. Тым не менш, добрая частка насельніцтва планеты перад адказнымі матчамі чэмпіянату свету па футболе чакала таго, што скажа васьміног Паўль.**



Пачалося ўсё з таго, што ўладальнікі акіянарыума Аберхаўзена (Германія) дзеля забавы вырашылі з дапамогай аднаго са сваіх гадунцоў прадказваць вынікі матчаў сваёй зборнай на Еўра-2008. Выбралі маладога васьмінога Паўля.

Працэдура прадказанняў наступная: Паўлю змяшчаюць два акварыумы з ежай. На адным намаляваны сцяг Германіі, на іншым — суперніка. З якога васьміног вырашае паесці, той і перамагае. Калі галаваногі не праяўляе цікавасці да ежы, то будзе нічыя.

На Еўра Паўль даў трапныя адказы ў пяці з шасці выпадкаў. Толькі ў фінале ставіў на перамогу немцаў, а іспанцы аказаліся мацнейшымі.

Нягледзячы на тую няўдачу, сёлета было вырашана паўтарыць эксперымент з васьміногам. І той пачаў даваць адзін за адным правільныя вынікі. І добра б, каб Паўль прадказваў толькі перамогі немцаў, але ён абсалютна дакладна адгадаў пройгрыш «бундэсшафт» ад Сербіі.

Ужо да плэй-оф да меркавання васьмінога пачалі прыслухоўвацца. А бліжэй да вырашальных матчаў ажыятаж вакол аракула быў неймаверны.

Паўль не падкачаў. Перад фіналам васьміногу прапанавалі паспрабаваць упершыню адгадаць вынік матчу, дзе не гуляе Германія. Васьміног паставіў на іспанцаў, якія і сталі чэмпіёнамі. Восем трапных стрэлаў з васьмі!

У многіх краінах свету спрабавалі знайсці жывёлу, якая б гэтак жа дакладна адгадвала вынікі матчаў, як васьміног, але дарэмна. Напрыклад, аўстралійцы спадзяваліся на кракадзіла Гары.

Раз'юшаныя аргенцінскія фанаты ўжо прапаноўваюць зварыць з Паўля суп. Тым не менш, прадстаўніца акіянарыума Таня Мунцыг заявіла, што Паўль сыходзіць на заслужаны адпачынак. Яму ўжо два гады, а васьміногі пражываюць максімум чатыры.

На форумах заўзятары сцябуцца, што васьміног павінен пакінуць па сабе нашчадка, якому б перадаў талент празорцы.

Канечне, зразумела, што прадказанні Паўля — не больш як забаўка. Магчыма, выпадковасць, магчыма, у адзін з акварыумаў клалі больш смачную ежу. Тым не менш, людзі хочуць верыць у звышнатуральнае і таямнічае. І васьміногі аракул ім у гэтым дапамог.

**ЗП**

## АНЕКДОТ

Трэба пазычыць у немцаў гэтага васьмінога і вызначыць, хто будзе адзіным кандыдатам ад апазіцыі на прэзідэнцкіх выбарах.

**Даслаў Павал Батуеў**

# «Если не владеете русским, советую заняться его изучением»

**Чыноўнікі на словах выказваюць павагу да мовы, але справаводства па-беларуску весці не спяшаюцца. Піша Ігар Случак, які рэгулярна рассылае ў афіцыйныя ўстановы запыты з прапановай перавесці справаводства на беларускую.**

«Дзяржаўнымі мовамі ў Беларусі з'яўляюцца беларуская і расійская». За час маёй персанальнай кампаніі «Справаводства па-беларуску!» на гэты радок Канстытуцыі і закону «Аб мовах» спасылаўся ці не кожны чыноўнік. І няхай пакуль гэтыя адказы былі фармальнымі адпіскамі, 60—65% іх былі напісаныя па-беларуску. У расійскамоўных адказах таксама было паважлівае стаўленне да беларускай мовы.

Хоць мова і знаходзіцца ў справаводчым заняпадзе, але большасць чыноўнікаў у сваіх паперах выказвалі да яе любоў і павагу. Але не ўсюды і не ўсе. Вось, да прыкладу, расійскамоўны адказ на зварот, падпісаны старшынёй Калінкавіцкага райсавета дэпутатаў В.М.Ціханоўскім: «Все депутаты поддерживают результаты референдума, на котором было принято решение о равнозначности белорусского и русского языков в Республике Беларусь», а разам з тым «...переводить делопроизводство на белорусский язык... не имеет смысла».

Ціханоўскі паведамляў мне, што «президент Республики Беларусь А.Г.Лукашенко очень доступно ответил на Ваш вопрос», хоць да прэзідэнта я з гэтым пытаннем і не звяртаўся. Відаць, пан Ціханоўскі вырашыў выступіць пасярэднікам паміж мной і прэзідэнтам і далучыў да адказу словы А. Лукашэнкі: «...вопросы языковые раз и навсегда в стране решены».

Атрымаўшы такі змястоўны ліст, я папрасіў даслаць мне яго на мове майго звароту. Сэнс адказу можна перадаць двума сказамі: «Ни в Законе «Об обращениях граждан», ни в Положении нет указания, что ответы гражданам дожны предоставляться на том языке, на котором было изложено поступившее обращение».

Адказ з Міністэрства энергетыкі падпісаны намеснікам міністра М.І.Міхадзюком, які выказаў мне падзяку «за проявленную заботу и инициативу по сохранению национальных ценностей». Я папрасіў даслаць мне адказ на беларускай мове і атрымаў ліст, зноў па-расійску, — скарочаны варыянт папярэдняга ліста. На трэці ліст я атрымаў амаль ідэнтычны расійскамоўны адказ. Відаць, міністэрства занятае нафтагазавай вайной.

З Міністэрства сельскай гаспадаркі прыйшоў вялікі змястоўны ліст падпісаны першай намесніцай міністра Н.М.Каткавец, дзе было адзначана, што «процесс перехода на белорусский язык в стране, где 81% населения — этнические белорусы, неизбежен», а таксама выказаная падзяка «за гражданскую позицию по возрождению духовности и сохранения национальности в Беларуси».

Я не сумняваўся, што змагу атрымаць і беларускамоўны варыянт ліста. Але адказ уяўляў сабой толькі «скарочаны варыянт», які змясціўся ў адным сказе, і пазнаку, што «перапіска з Вамі па дадзеным пытанні спыняецца».

Таму мне зноў давялося папрасіць поўны беларускамоўны адказ. Прыйшоў падпісаны Каткавец ліст наступнага зместу: «Нягледзячы на тое, што Вы не з'яўляецеся дзяржаўным служачым, як беларускі грамадзянін, які атрымаў адукацыю ў Беларусі, Вы павінны таксама валодаць дзвюма мовамі, паколькі абавязкова вывучалі іх у вучэбных установах нашай радзімы. Вельмі прыемна, што Вам больш падабаецца размаўляць на беларускай мове, але гэта не можа быць прычынай таго, каб дзяржаўныя служачыя нашай установы марнавалі службовы час на пераклад лістоў, паблажаючы Ваш капрыз».

Але рысу пад тым месцам, дзе знаходзяцца беларускамоўныя ў Беларусі, падвёў рэктар прыватнага Мінскага інстытута кіравання, доктар эканамічных навук, прафесар М.В.Суша:

«В соответствии со ст. 17 Конституции Республики Беларусь государственными языками в Республике Беларусь являются белорусский и русский. В Минском институте управления все делопроизводство ведется на русском, т. е. государственном языке. Если Вы, господин Случак, не владеете одним из государственных языков — русским, то советую Вам заняться его изучением. Изучив русский язык, Вы тем самым сможете поднять свой культурный уровень и несколько расширить имеющийся у Вас кругозор.

На этом переписку по поднятому Вами вопросу считаю законченной, поскольку ее продолжение не имеет смысла и является пустой тратой дорогостоящего рабочего времени.

Желаю Вам успехов в изучении русского языка. Это тем более важно, что одним из критериев определения культурного уровня человека всегда считалось владение им не одним, а двумя или несколькими языками».

Як відаць, пакуль беларуская мова не набудзе статуса адзінай дзяржаўнай мовы ў Беларусі альбо пакуль закон «Аб мовах» не забяспечыць сапраўды роўнага статуса абедзвюх моваў, беларускамоўнага чалавека будуць дыскрымінаваць, а беларуская мова будзе ў заняпадзе.




# Шыла даб'ецца павышэння заробку салдатаў

**Стартавала кампанія «Наша армія» (armyby.info). Яе ініцыятар — сам нядаўні салдат, Іван Шыла з Салігорска.**

**«Наша Ніва»: Якая мэта кампаніі?**

**Іван Шыла:** На першым этапе — палепшыць умовы праходжання тэрміновай службы для звычайных салдат. Так выйшла, што я трапіў у войска. Там я сутыкнуўся з мноствам хібаў сістэмы, якія можна вырашыць. Многія, сыходзячы з войска, спрабуюць хутчэй на яго забыцца. Мяне ж хвалюе гэтая праблема, я магу пра яе меркаваць з уласнага досведу. Бачачы тыя неадпаведнасці вайсковым стандартам, мне хочацца спрычыніцца да зменаў у нашай арміі. Апроч мяне ёсць яшчэ некалькі былых і сённяшніх вайскоўцаў, якія ўдзельнічаюць у кампаніі.



**Іван Шыла**
Нарадзіўся ў 1990 у Салігорску. Намеснік старшыні «Маладога фронту». У 2007 быў асуджаны па крымінальнай справе за ўдзел у незарэгістраванай арганізацыі. Летам 2008 выключаны з сярэдняй школы за дзень да апошняга экзамену. Праз паўгоду прызваны ў армію. Службу праходзіў у вёсцы Межыца (Лепельскі раён). Камісаваны ў снежні.

**«НН»: Чаго канкрэтна вы дабіваецеся?**

**ІШ:** Змяншэння тэрміну службы. Магчымасці паступлення для салдатаў, каб іх адпускалі здаваць тэсты. Цяпер прызываюць і завочнікаў. Дык вось, дабіваемся, каб яны маглі два-тры разы за час службы быць у адпачынку падчас сесіі. Гэта не падарве баявой моцы войска, а вось для салдатаў будзе канкрэтная карысць. У статуце запісаныя рэгулярныя звальненні, але іх практычна няма. Салдат атрымлівае заробак у 8 даляраў. Гэта прыводзіць да таго, што дарослыя хлопцы, якім па 25 гадоў, зноў вымушаныя прасіць грошы на існаванне ў бацькоў. Дабіваемся павышэння заробкаў.

**«НН»: Гэткія ідэі знойдуць прыхільнасць сярод салдатаў?**

**ІШ:** Натуральна. Яны не тое каб папулісцкія, але вельмі папулярныя ў армейскім асяродку. Прычым нічога надзвычайнага ў гэтых патрабаваннях няма. Тое самае ёсць у Расіі і Украіне. Прыбалтыйскія краіны праз гэта прайшлі ўжо 10-15 гадоў таму. У войску існуе мноства праблемаў. Тая ж дзедаўшчына. Толькі ў маёй часткі ў вёсцы Межыца 15 чалавек былі асуджаныя на розныя тэрміны зняволення менавіта за дзедаўшчыну, збіццё і здзек з прызыўнікоў. У войску гінуць людзі, гэта таксама ёсць. Але ў нас практычна ніхто не піша, не цікавіцца войскам. Яно працягвае заставацца такім сабе закрытым грамадствам унутры краіны.

**«НН»: Вашы прапановы зробяць войска больш моцным?**

**ІШ:** Мы хочам, каб салдат перастаў негатыўна ўспрымаць войска. Зрабіць службу менавіта службай, а не капаннем акопаў пад высокія словы аб патрыятызме. Калі ў Міністэрстве абароны нашых прапановаў не пачуюць, то будзем збіраць подпісы. Шмат сабраць не здолеем, але тысячу-дзве — абавязкова.

**«НН»: А супрацоўніцтва з Міністэрствам абароны магчымае?**

**ІШ:** Мне б вельмі гэтага хацелася. Але «Беларуская вайсковая газета» прыняла ў штыхі нашыя прапановы. Увогуле, армія — гэта досыць інертная структура. І ў войску, і пасля яго я шмат размаўляў з афіцэрамі. Яны цудоўна разумеюць сітуацыю ўнутры арміі, але не хочуць публічнасці, абмеркавання. Калі іх пытаеш, ці гатовыя яны падпісацца пад словамі, сказанымі прыватна, то сустракаешся толькі з іх іранічнай усмешкай.

**Гутарыў ЗП**

**Зміцер Хведарук — яфрэйтар**
Палітпрызыўнік працягвае праходзіць службу ў чыгуначных войсках у Жодзіне. За месяц да дэмбеля Хведарука нечакана павысілі ў званні. Ён атрымаў лычкі яфрэйтара. Дамоў Зміцер прыйдзе пры канцы ліпеня.

# На каго ў Беларусі можа абаперціся Расія?

**Лідэр Руху «За Свабоду» Аляксандр Мілінкевіч заяўляе, што на гэтых выбарах Расія падтрымае не Аляксандра Лукашэнку, а іншага чалавека. На каго з палітыкаў, на якія структуры можа абаперціся Расія ў Беларусі?**

### «Імперыя» Юрыя Баранчыка

Апошнім часам у інтэрнэце з'явілася некалькі сайтаў, якія асвятляюць беларускія навіны, але не хаваюць сваёй прарасійскай пазіцыі. Найперш тут варта адзначыць інфармацыйна-аналітычны партал «Імперыя» (imperiya.by).

Адным з пачынальнікаў гэтага праекту з'яўляецца Юрый Баранчык. Ён раней працаваў у Акадэміі кіравання пры прэзідэнце, але потым сышоў адтуль. Баранчык займае пазіцыю непрымання дзейнай улады. Пры гэтым ягоныя кантакты з апазіцыяй досыць абмежаваныя.

Нейкі час Баранчык уваходзіў у склад «Беларуска-расійскай інтэграцыйнай рады». Яна была створаная былым кіраўніком Адміністрацыі Лукашэнкі Леанідам Сініцыным і экс-дэпутатам палаты прадстаўнікоў Уладзімірам Парфяновічам. Сініцын і Парфяновіч звярнулі на сябе ўвагу тым, што прапанаўвалі Беларусі ўвайсці ў склад Расіі.

Два гады запар мітынгі на 2 красавіка (так званы дзень яднання народаў Беларусі і Расіі) на плошчы Бангалор ладзілі калегі Парфяновіча па парламенцкай групе «Рэспубліка» Валер Фралоў і Сяргей Скрабец. Мітынгі тыя вылучаліся надзвычайнай маламалікасцю. На першы прыйшлі ўвогуле тры чалавекі — Фралоў, Скрабец і брат Скрабца.

Валеры Фралоў сёлета і патлумачыў сваё рашэнне балатавацца тым, што не бачыць прарасійскіх палітыкаў у Беларусі. Ён спадзяецца заняць гэтую нішу.

### Калякін за адзіную валюту

Не сціхаюць размовы пра фінансаванне Расіяй кампаніі «Гавары праўду». Але гэта ў большай ступені ўсё яшчэ здагадкі, а не медыцынскі факт. Сам Уладзімір Някляеў кажа, што грошы на паштоўкі і аргпрацу далі беларусы, вымушаныя з'ехаць у Расію.

Раней пра сувязі з Масквой гаварылі ў дачыненні да экс-кандыдата на пасаду прэзідэнта Аляксандра Казуліна. Пасля выхаду з турмы Казулін наведваў Дзяржаўную Думу Расіі на запрашэнне старшыні думскага камітэта ў справах СНД і суайчыннікаў Аляксандра Астроўскага.

Характэрна, што Казулін быў адным з герояў нядаўняга рэпартажу па НТВ «Хросны Бацька». Былы палітвязень быў першым і апошнім, каму ў эфіры далі слова.

Лідэр БСДП Анатоль Ляўковіч летась «папаліўся» на лістах да кіраўніцтва пракрамлёўскай партыі «Справядлівая Расія». Там Ляўковіч пазіцыянаваў сябе яшчэ большым прыхільнікам інтэграцыі, чым Лукашэнка.

Старшыня посткамуністаў Сяргей Калякін нарабіў шораху сваімі заявамі пра неабходнасць увядзення ў Беларусі адзінай валюты з Расіяй. За патрабаванне прызнання незалежнасці Абхазіі і Асеціі партыя Калякіна ледзь не была выключаная з АДС.

Каардынатар «Еўрапейскай Беларусі» Андрэй Саннікаў таксама намякаў, што не быў бы супраць падтрымкі з боку Масквы. Пры гэтым ён увесь час падкрэслівае, што пытанне правоў чалавека і інтэграцыя ў ЕС застаюцца прыярытэтнымі.

### Казакі на абароне «рускай сутнасці і праваслаўя»

За беларуска-расійскую інтэграцыю выступае сайт «Кальцо патрыятычных рэсурсаў Беларусі» (allbel.org), які рэдагуе актыўны блогер Стас Алаў. Сайт у асноўным спецыялізуецца на кампрамаце — яўна кагэбісцкага паходжання — на адрас апазіцыі. І хоць Някляеў называецца на сайце «нестандартнай апазіцыяй», да яго таксама крытычнае стаўленне.

Тым не менш, у медыйным канфлікце з Расіяй пасля «Хроснага Бацькі» старонка Стаса Алава падтрымала менавіта Лукашэнку. І хоць аўтар прапагандуе ідэі заходнерусізму, ён застаецца верны дзейнай уладзе. Што ўказвае на ўнутрыбеларускія карані Алава.

Яшчэ адным апірышчам расійцаў могуць стаць казакі. «Мужныя, смелыя, гарача адданыя сваёй Радзіме казакі былі сацыяльным пластом беларускага народа, верна служачы яму, бароняча нашу рускую сутнасць і праваслаўную культуру ад каталіцкага ўплыву», — пішацца на сайце беларускіх казакоў.

Зрэшты, ніякай еднасці ў беларускім казацкім руху ў Беларусі не існуе. Ён раздроблены на некалькі варагуючых паміж сабой груповак.

### Можа, і КДБ

Папулярным ёсць меркаванне, што ў выпадку неабходнасці Крэмль можа знайсці падтрымку ў нетрах КДБ. Маўляў, чэкісты па сённяшні дзень не да канца адданыя Лукашэнку. З іншага боку, погляд досыць спрэчны. Апошнія кадравыя перастаноўкі засведчылі, што прафесійных чэкістаў на кіроўных пасадах у КДБ засталося не так і шмат — хто прыходзіць з памежнікаў, хто з іншых сілавых структур.

За час распаду СССР вырасла новае пакаленне спецслужбістаў, якія ўжо нават не вучыліся ў Расіі. А выраслі як прафесіяналы непасрэдна ў Беларусі.

### «Союз русского народа» і фанаты

Існуе колькі маргінальных прарасійскіх арганізацый. Напрыклад, мінская група «Союза русского народа», заснаваная ў 2007 годзе. Напісана, што група ўяўляе сабой грамадскі рух, які аб'ядноўвае ў сабе ўсе законныя метады праяўлення грамадзянскай самасвядомасці, што замацоўвае праваслаўны светапогляд».

Засталіся якія-ніякія аскепкі Славянскага сабора «Белая Русь» (з яго выйшлі ідэолагі лукашэнкаўцаў Юрый Азаронак і Усевалад Янчэўскі) і фашыстоўскай РНЕ.

Існуе «Мінскі манархічны форум», дзе гуртуюцца прыхільнікі расійскага вялікадзяржаўя. Адной з найбольш папулярнай там тэмаў з'яўляецца «здрада Лукашэнкі».

Ідэі «праваслаўя — самадзяржаўя — народнасці» папулярныя і сярод часткі футбольных фанатаў. Напрыклад, з групоўкі «Lads82». На матчах мінскага «Дынама» яны вывешваюць расійскую «імперку».

**Зміцер Панкавец**




**«Беларускія казакі» — арганізацыя, сфармаваная на ўзор расійскага казацтва.**

# Юры Баранчык: Някляеву час вызначацца

**Гутарка з палітолагам, рэдактарам сайта imperiya.by.**

**«Наша Ніва»: Ці ёсць імавернасць таго, што Расія не падтрымае на выбарах Лукашэнку?**

**Юры Баранчык:** У прынцыпе, ёсць. Асабліва калі ўлічыць апошнія падзеі ў міждзяржаўных адносінах. Маю на ўвазе газавы канфлікт, падпісанне Мытнага саюза.



**Юры Баранчык**

нарадзіўся ў 1972. Кандыдат філасофскіх навук, былы дырэктар Інфармацыйна–аналітычнага цэнтра НДІ Тэорыі і практыкі дзяржаўнага кіравання Акадэміі кіравання пры прэзідэнце. Кіраўнік інтэрнэт–праекту imperiya.by.

**«НН»: Што канкрэтна Маскве не падабаецца ў паводзінах Лукашэнкі?**

**ЮБ:** Тут цэлы шэраг момантаў. Адмова падтрымаць Расію ў асяцінскім канфлікце, заігрыванне з Захадам, невыкананне двухбаковых абавязкаў. Пры гэтым Лукашэнка не спыняецца выбіваць з Расіі датацыі. Здаецца, што такая несумленнасць і абурыла расійскае кіраўніцтва.

**«НН»: А кіргізскі варыянт падзей у Беларусі рэальны?**

**ЮБ:** Я не думаю. Асабіста я працівнік такога развіцця падзей. Чаму ў Кыргызстане так склалася? Бо нядаўна прайшлі прэзідэнцкія выбары, і чакаць наступных яшчэ тры гады людзі не маглі, гледзячы на тыя бясчынствы, што вытваралі Курманбек Бакіеў са сваім сынам. Таму і ўзніклі беспарадкі. Для нас больш прымальны варыянт свабодных і адкрытых выбараў, каб усе кандыдаты атрымалі роўную колькасць эфірнага часу, роўныя магчымасці. І не так важна, хто пераможа. Вось ва Украіне на свабодных выбарах перамог Януковіч з дапамогай амерыканцаў. Цяпер Ющэнка сышоў, і ўжо мала хто помніць пра такога прэзідэнта. Тое самае павінна паўтарыцца і ў нас.

**«НН»: Але на сёння такі варыянт выглядае фантастычным.**

**ЮБ:** Сапраўды, варыянт малаверагодны. Зрэшты, гэта залежыць ад таго, у якім стане на выбары пойдуць працаўнікі дзейнай улады. Вось была сітуацыя ў Сербіі. Апазіцыя ішла на выбары з канкрэтнымі фактамі фальсіфікацый. У нас апазіцыя пакуль досыць інертная. Зрэшты, пазіцыя ЗША і Еўрасаюза па беларускім пытанні заўсёды была яснай; калі да іх далучыцца Расія, гэта будзе іншая справа. Калі нават найбліжэйшыя партнёры не прызнаюць яе легітымнасці.

**«НН»: У адным з апошніх артыкулаў Вы пісалі, што Масква яшчэ дае Лукашэнку шанец сысці прыгожа.**

**ЮБ:** Гэта было б найбольш адэкватна і прымальна як для самога кіраўніцтва, так і для беларускага народа. Трэба лагічна і рацыянальна растлумачыць гэтае рашэнне. Можна ж не проста сысці, а забяспечыць варыянт з пераемнікам. Важна таксама захаваць стабільнасць у пераходны перыяд.

**«НН»: А некага з апазіцыянераў Масква можа падтрымаць?**

**ЮБ:** Ну, як на мой погляд, то апазіцыя заўсёды была празаходнай. То няхай яе падтрымлівае Захад, але ён не можа. Што датычыць Саннікава, то ён заўсёды пазіцыянаваў сябе як палітык празаходні. Спроба сыграць на расійскай карце хутчэй заключаецца ў тым, што ён мае адносіны з часткай расійскіх апазіцыянераў. Уладзімір Някляеў пакуль не мае яснай пазіцыі ў гэтым пытанні. Да выбараў засталося не так шмат часу, час ужо і вызначыцца. Някляева толькі Мілінкевіч называе прарасійскім. Сябе ж Мілінкевіч называе прабеларускім, пры гэтым жыве за амерыканскія грошы.

**«НН»: Інфармацыйная атака ў расійскіх СМІ на беларускае кіраўніцтва будзе працягвацца?**

**ЮБ:** Будзе залежаць ад паводзін Мінска. Калі з'явяцца новыя агрэсіўныя выпады ў бок Масквы, то не выключана, што будзе працяг тых перадач, што паказваліся на НТВ і «России». Проста трэба паводзіць сябе ў рамках прыстойнасці і не выносіць на людзі тыя супярэчнасці, што накапіліся паміж двума прэзідэнтамі.

**Гутарыў ЗП**

# Што ў Беларусі расійскае

Працяг са старонкі 1.

## Банкі

З 32 банкаў, зарэгістраваных у Беларусі, восем заснаваныя на расійскіх грошах.

Банк «Масква—Мінск» узнік на базе «Масбізнэсбанка», які быў прызнаны банкрутам. 66% акцый належыць ураду Масквы і яго дачыным кампаніям. Нездарма каля галоўнага офіса банка нядаўна адкрыўся велічны Дом Масквы, будаўніцтва якога было цалкам аплачана расійскім бокам. Яшчэ каля 20% акцый банка мае мільянер Андрэй Барадзін.

«Белгазпрамбанк», як вынікае з назвы, з'яўляецца даччынай структурай расійскага «Газпрамбанка». Усходнім суседзям належыць больш за 98% акцый. Рэшта дзеліцца на долю Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі і «Белтрансгаза».

Расійскі «Внешэкономбанк» купіў беларускі «Белзнешэканомбанк»(98% акцый у расійцаў). І «Банк ВТБ» таксама на 71% належыць расійцам.

«МТБанк» на 64% належыць аўтахолдынгу «Атлант-М», афіцыйнаму дылеру кампаній «Форд» і «Фальксваген» у Беларусі. Сярод суўладальнікаў уплывовага ходынга, штогадовы абарот якога перавышае $2 мільярды, ёсць і беларус Алег Хусаенаў, і расіянін Ігар Мальгін. Менавіта апошняму прыпісваюць галоўную ролю ў кіраўніцтве паспяховай кампаніяй.

«Альфа-банк» знаходзіцца ва ўласнасці аднаго з найбагацейшых расійскіх алігархаў Міхаіла Фрыдмана. У 2008 той выкупіў у Нацбанка і непальскіх бізнэсоўцаў долю ў «Межторгбанку» і перайменаваў той у адпаведнасці з назвай свайго канцэрна «Альфа-груп».

Расійска-французскай установай можна назваць «Белрасбанк». 100% яго акцый сканцэнтраваныя ў руках «Расбанка», кантрольны пакет акцый якога, у сваю чаргу, належыць французскай інфестыцыйнай групе, а рэшта — алігарху Уладзіміру Патаніну.

Адна з галоўных нагод для гонару беларускіх уладаў — прыватызацыйны продаж «Белпрамбудбанка». Ягоны пакупнік, расійскі «Сбербанк», заплаціў у канцы мінулага году $280 мільёнаў за 93% акцый і цяпер збіраецца выкупаць астатнія долі ў дробных акцыянераў.

## Будаўніцтва

Першы мінскі хмарачос «Ветразь», «Мінск-Сіці», жылыя кварталы — расійскія праекты ходзяць у фаварытах у Аляксандра Лукашэнкі.

«Ітэра» алігарха Ігара Макарава будзе мець 70% акцый у спраектаваным «Мінск-Сіці». Нягледзячы на прэзідэнцкія пагрозы, права на будаўніцтва элітнага раёна ў расійцаў пакуль што застаецца. Вось толькі сама «Ітэра» не нацэльваецца на элітнасць жылля — «Мінск-сіці» будзе «ўпрыгожаны» панэльнымі шматпавярховікамі. Падвялі расійцы і пры будаўніцтве хмарачоса «Ветразь». Яны абяцалі ўзвесці праз дарогу ад жылога дома яшчэ і бізнэс-цэнтр, але ў апошні момант сталі ненавязліва прапаноўваць пабудаваць замест яго яшчэ адзін шматкватэрнік.

А вось раёны «Маскоўскі» і «Лебядзіны» — супольная ініцыятыва беларускіх уладаў і мэра Масквы Юрыя Лужкова. «Маскоўская інвестыцыйная будаўнічая кампанія» атрымала прэстыжныя кавалкі зямлі пад жылыя дамы. Будаўніцтва першага з раёнаў ужо заканчваецца.

## Мабільная сувязь

Галоўны гулец на мабільным рынку Беларусі — кампанія МТС. Яе нельга назваць выключна расійскай, бо ААТ «МТС» на чале з алігархам Уладзімірам Еўтушэнкавым валодае 49% акцый мабільнага аператара. Кантрольны пакет трывала трымае ў сваіх руках беларуская дзяржава. І зусім не збіраецца расставацца са сваёй доляй, нягледзячы на шматлікія захады расійскага боку.



Юлія Дарашкевіч

**Расійскія інвестыцыі ў Беларусь, агульны аб'ём і доля ад сукупнага аб'ёму замежных інвестыцый**

| | | |
|---|---|---|
| 2007 | $1,82 мільярда | 33,50% |
| 2008 | $2,17 мільярда | 33,20% |
| 2009 | $6,08 мільярда | 65,30% |

Наўпростае дачыненне да мабільнай сувязі маюць сеткі салонаў сувязі. Уладальнік групы кампаній «Сувязны» Максім Нагаткоў прыйшоў на беларускі рынак у 2007 на месца мясцовай сеткі «Мегаплюс». Цяпер ягоны бізнэс у краіне прадстаўлены 24 салонамі ў сталіцы. Па ўсёй краіне іх колькасць перавышае сотню. Дзейнасць ажыццяўляецца пад сцягам ЗААА «Белая Вежа».

Прадстаўніцтва «Еўрасеткі» ў Беларусі з паказальным расійскім сцягам на шыльдзе заўсёды было ў цэнтры грамадскага абмеркавання. То кампанія не паразумелася з МТС, то абвяшчала пра магчымы сыход з беларускага рынку. Скандалы скончыліся адразу пасля таго як эпатажны алігарх Яўген Чычваркін прадаў бізнэс «Альфа-групе» Міхаіла Фрыдмана. Цяпер расійцы не нарадуюцца на беларускае прадстаўніцтва, называючы яго самым паспяховым. Заклад прыбытковасці кампаніі ў тым, што яна першай стала працаваць з усімі трыма аператарамі мабільнай сувязі фармату GSM — МТС, «Велкомам» і «Лайфам».

## Маркеты

Прадстаўніцтва Расіі ў беларускім рытэйле пакуль не моцнае, але расце. З гіпермаркетаў, апроч сумеснага «Прастора», усходнія грошы круцяцца толькі ў гродзенскім «Алмі». І тое яго ўзначальвае беларус па паходжанні Аляксандр Зарыбка, які з'яўляецца адным з суўладальнікаў расійскай групы кампаній «Вікторыя».

Капітал сталічных гіпермаркетаў «Прастор», які прынята лічыць вотчынай бярозаўца Юрыя Чыжа, падзелены паміж ім і расійскім «Сёмым кантынентам». Расійская кампанія перажывае не найлепшыя часы. Яе даўгі перавышаюць $300 мільёнаў, і да адкрыцця новых «Прастораў» у спальных раёнах Мінска расійцы дачыненне не мелі.

Сетка ўніверсамаў «Белмаркет» аперуе меншымі лічбамі тавараабароту. Яна пачала заваёўваць беларускі рынак з Жодзіна і Магілёва. Уладальнік — усё тая ж фрыдманаўская «Альфа-груп».

**Яўген Васількоў**

МЕРКАВАННІ

# Адносіны між Лукашэнкам і Крамлём выйшлі на ўзровень пагрозаў смерцю

У фільме «Хросны Бацька» не заўважылі некалькіх прынцыповых момантаў. Піша **Уладзімір Падгол**.

Тыя, хто ўважліва глядзеў фільм, адзначылі кароткія кадры, дзе паказалі былога старшыню КДБ Мацкевіча і былога генпракурора Бажэлку. Калі вобраз Лукашэнкі ў фільме насычаны адмоўнымі якасцямі, то Мацкевіч і Бажэлка маюць станоўчую характарыстыку. Яны сталі на шляху злачынцаў, і Лукашэнка іх адправіў у адстаўку. Адзіныя, хто паспрабаваў пакараць злачынцаў, — гэта Мацкевіч і Бажэлка. Калі зыходзіць з нашай сітуацыі, нехта такі, як яны, і ёсць патэнцыйным чалавекам, на якога Масква можа зрабіць стаўку ці на выбарах, ці пасля, калі паўторыцца кіргізскі варыянт. Мне могуць запярэчыць: у фільме паказалі Лябедзьку, Статкевіча, Ярашука, Казуліна. Так. Але іх паказалі ці ахвярамі (Статкевіч, Казулін), ці экспертамі (Лябедзька, Ярашук).

Другая тэма і, бадай, галоўная — пашырэнне дыяпазону сродкаў псіхалагічна-інфармацыйнай вайны між уладальнікамі Крамля і ўладаром Беларусі.

Галоўнае абвінавачанне на адрас Лукашэнкі ў фільме — датычнасць да арганізацыі забойстваў апанентаў. І вось працяг тэмы жыцця і смерці ў СМІ. «Комсомольская правда» піша, што «фільм жорсткі. Лукашэнка ў ім паказаны хітрым і нават жорсткім чалавекам, які фізічна распраўляецца са сваімі апанентамі. Пасля такіх сцэнаў альбо ідуць страляцца пад сцягам, альбо згараюць ад сораму».

Тэму працягвае акадэмік Рубінаў у «Советской Белоруссии», у абарончым артыкуле.

«Пуціна ў крэсла прэзідэнта «за ручку» прывёў Ельцын. Мядзведзева таксама за ручку прывёў Пуцін. Ніхто з іх... не заваяваў свой аўтарытэт у адкрытай палітычнай барацьбе з канкурэнтамі... Калі Пуцін прыйшоў да ўлады, Лукашэнка, які меў агромністы аўтарытэт і папулярнасць у расійскім асяроддзі, уяўляў для яго пэўную небяспеку. ...Справы ў Беларусі хуткімі тэмпамі ідуць угару. ... Чаго добрага, і расійскі народ захоча пайсці па такім шляху. А тады — бывай, улада... Гэтага нельга дапусціць ні ў якім разе. Бо гэта пытанне жыцця і смерці для щлады і тых, хто мае грошы». Недвухсэнсоўна Рубінаў піша пра смяротную небяспеку, якую нясе палітычная кар'ера Лукашэнкі для ўладароў Крамля.

А ў такіх выпадках бывае наступнае: ці яны — яго, ці ён — іх.

Нагадаю пра лёс генерала Лебедзя. Прэзідэнцкая кампанія зрабіла яго ўлюбёнцам мільёнаў. Верталёт з Лебедзем, які пасля выбараў узляцеў у крэсла губернатара далёкага ад Масквы края, нечакана бразнуўся аб зямлю, і сёння памяць пра яго расцярушылася.

На маю думку, фільм НТВ і рэакцыя на яго сведчаць, што сёння тая зямная перспектыва для гаспадара Беларусі павялічылася да 100 адсоткаў. Гэта новая платформа Крамля ў дачыненні да Лукашэнкі.

**Уладзімір Падгол**
палітолаг, псіхолаг, медыяаналітык.

### ПОГЛЯД З МАСКВЫ

Дзяваца А.Лукашэнку ад Расіі няма куды. Інакш яго чакае лёс Ганчара і Захаранкі. Бо непасрэдныя ўдзельнікі гэтых злачынстваў на свабодзе. Раптам спатрэбяцца?

**Андрэй Суздальцаў, расійскі аналітык, які спецыялізуецца на Беларусі, на сайце politoboz.com**

## Ці сапраўды магчымы тэрарыстычны замах?

Уладзімір Падгол заходзіць у сферу чыстых спекуляцый. У каментары Рубінава няма ніякіх пагрозаў смерці. Няма іх і ў заявах расійскага кіраўніцтва. Аўтар грунтуецца не на канкрэтных фразах, а на эмацыйным фоне, які сыходзіць ад канфлікту. І памятаем, што постсавецкія кіраўнікі выкарыстоўвалі крайнія сродкі ў змаганні за ўладу.

Саакашвілі сапраўды не выключаў пагрозы сваёй фізічнай ліквідацыі ў часе расійска-грузінскага канфлікта.

Але ёсць адзін нюанс. Пасля трагічнай смерці Леха Качынскага ў Расіі любое іншае «здарэнне» з кіраўніком, які канфліктуе з Масквой, выглядала б крайне падазроным.

Лукашэнка адзіны не абвесціў жалобы па Качынскім, хоць, можа, павінен быць яму ўдзячны найболыш.

**Барыс Тумар**

Меркаванні ў артыкулах на старонцы «Каментары» могуць супадаць, а могуць і не супадаць з меркаваннем Рэдакцыі.

# Мілінкевіч: Прарасійскі кандыдат вызначыцца пазней


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Лідэр Руху за Свабоду супраць яднання з прарасійскімі палітыкамі.

Кандыдат у прэзідэнты ад Незалежніцкага блоку пачаў сустрэчы з актывам. Першая адбылася ў Мінску, другая — у Гомелі.

На абедзвюх ён найперш перасцярог ад падтрымкі магчымых расійскіх сцэнароў на выбарах.

«Сёння галоўнае не «хто», а «куды». Не хто мае замяніць Лукашэнку, а па якім шляху новы кіраўнік павядзе Беларусь», — лічыць лідэр Руху «За Свабоду» Аляксандр Мілінкевіч.

На ягоную думку, кандыдат, якога падтрымаюць уладныя колы Расіі, вызначыцца крыху пазней. «Ён не будзе на словах ані прарасійскі, ані празаходні і паспрабуе яднаць пратэстны электарат не на пазітыўнай беларускай ідэі, а па прынцыпе «супраць каго сябруем».

Прабеларускія сілы, мяркуе палітык, мусяць прадэманстраваць адказнасць, аб'яднацца і прапанаваць сваю мадэль беларускай дзяржавы, сваё бачанне будучыні краіны, незалежнай і еўрапейскай.

«Ва ўмовах сур'ёзных эканамічных праблемаў у краіне робіцца верагодным прыход да ўлады і новага папуліста, прарасійскага, напрыклад. Важна, каб усе разумелі, што ідзе барацьба не толькі за правы чалавека, але і за незалежнасць краіны, якую мы лёгка можам страціць. Вось чаму я не магу пагадзіцца з тымі, хто мяркуе, што грошы не пахнуць, і рыхтуецца праводзіць кампанію на расійскія грошы. Бо раней ці пазней будзе прад'яўлены рахунак з вядомым патрабаваннем», — адзначыў Мілінкевіч.

### «Расія паставіць на іншага чалавека».

У перадвыбарчы штаб Аляксандра Мілінкевіча ўжо запісалася першая тысяча чалавек. Плануецца, што да выбараў гэтая лічба толькі ўзрасце.

Экс-кандыдат на пасаду прэзідэнта пачаў новае турнэ па гарадах Беларусі. Пачаў з Гомеля, на сустрэчы ў абласным цэнтры сабралося больш за сотню чалавек. Мілінкевіч і там узняў тэму прарасійскага кандыдата.

Мілінкевіч выказаў меркаванне, што ў цяперашняй палітычнай сітуацыі на прэзідэнцкіх выбарах Расія наўрад ці «дасць Лукашэнку капітальную падтрымку». «Думаю, на выбарах Расія паставіць на іншага чалавека, прозвішча якога я не ведаю», — заўважыў палітык.

**ЗП**

**Рэйтынгі палітыкаў**

Вынікі чэрвеньскага апытання НІСЭПД. Задавалася пытанне: «Набліжаюцца чарговыя выбары прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Некаторыя палітыкі і грамадскія дзеячы ўжо заявілі (ці, магчыма, заявяць) аб намеры вылучыць на іх сваю кандыдатуру. Калі іх імёны апынуцца ў выбарчым бюлетэні, за каго б Вы прагаласавалі?» Адказы размеркаваліся так (у працэнтах):

**Аляксандр Мілінкевіч**, лідэр Руху «За Свабоду» — 9,9;

**Аляксандр Казулін**, былы рэктар Белдзяржуніверсітэта — 7,5;

**Сяргей Гайдукевіч**, старшыня Ліберальна-дэмакратычнай партыі — 3,5;

**Алесь Міхалевіч**, былы намеснік старшыні Партыі Беларускі Народны Фронт — 2,4;

**Сяргей Калякін**, старшыня Беларускай партыі левых «Справядлівы свет» — 1,9;

**Аляксандр Ярашук**, старшыня Беларускага кангрэсу дэмакратычных прафсаюзаў — 1,6;

**Уладзімір Някляеў**, лідэр грамадзянскай кампаніі «Гавары праўду!» — 1,6;

**Віталь Рымашэўскі**, сустаршыня незарэгістраванай партыі «Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя» —1,0;

**Яраслаў Раманчук**, намеснік старшыні Аб'яднанай грамадзянскай партыі — 1,0;

**Мікалай Статкевіч**, старшыня сацыял-дэмакратычнай партыі «Народная Грамада» — 0,8;

**Лявон Баршчэўскі**, былы старшыня Партыі БНФ — 0,7;

**Андрэй Саннікаў**, каардынатар грамадзянскай ініцыятывы «Еўрапейская Беларусь» — 0,5;

За іншага — 2,3;

Цяжка адказаць / няма адказу — 17,0.

**Аляксандр Лукашэнка**, кіраўнік Рэспублікі Беларусь — 48,3.

# Пра Мытны саюз альбо кепска, альбо нічога

Адной з галоўных падзеяў мінулага тыдня сталася падпісанне Беларуссю, Расіяй і Казахстанам Мытнага саюза. Як адрэагавалі на гэтую падзею палітыкі, што збіраюцца балатавацца на пасаду прэзідэнта?

Найбольш жорсткую пазіцыю тут заняла Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя. Кандыдат ад БХД Рымашэўскі не выказваўся, але вуснамі Паўла Севярынца было агучана, што «хадэкі» «расцэньваюць падпісанне Мытнага саюза з Расіяй і Казахстанам як найвялікшы геапалітычны правал апошніх гадоў».

«Эканамічная выгада ад такой «інтэграцыі» можа стаць для Беларусі катастрафічнай. Саюз з адсталымі ў эканамічным сэнсе і недэмакратычнымі рэжымамі — загадзя пройгрышны. Уступленне ў Сусветную гандлёвую арганізацыю «ўтрох» — бязглуздзіца. Савецкая настальгія і жаданне застацца пры ўладзе любой цаной не могуць зрабіць з Лукашэнкі абаронцу нацыянальных інтарэсаў», — лічыць П.Севярынец.

Блізкую пазіцыю заняў лідэр Руху «За Свабоду» Аляксандр Мілінкевіч. «Тактычна ў Мытным саюзе могуць быць некаторыя перавагі. Але стратэгічна гэта наша параза. Мытны саюз будзе перашкодай у інтэграцыі Беларусі ў Еўрапейскі саюз», — лічыць Аляксандр Мілінкевіч.

«Зрэшты, некалі мы думалі, што не зможам выйсці з дамовы аб саюзнай дзяржаве. Але яна аказалася звычайнай бурбалкай. Так адбываецца з усім, што робіцца няшчыра», — працягвае экс-кандыдат на пасаду прэзідэнта.

Сацыял-дэмакрат Мікола Статкевіч бачыць у Мытным саюзе як мінусы, так і плюсы. «Да пазітыўных момантаў можна аднесці тое, што будзе захоўвацца доступ да дастаткова вялікага рынку. Негатыўныя — у тым, што мы адначасова можам абцяжарыць свой доступ да іншых рынкаў і такім чынам стаць больш прывязанымі да адной эканомікі, адной краіны, што не ёсць рацыянальным».

А вось кандыдат ад АГП Яраслаў Раманчук не бачыць перспектываў такога ўтварэння. «Лукашэнка далучыўся да саюза, у які ён не верыць, каб не сутыкнуцца з вельмі жорсткім супрацівам на мяжы з Расіяй. Я не думаю, што ён будзе выконваць абавязкі, якія вынікаюць з Мытнага саюза. Ёсць вялікая верагоднасць таго, што гэты Мытны саюз ператворыцца ў мёртвую структуру, як СНД, ЭўрАзЭС. Будзе больш канфліктаў, чым было, бо кожны з бакоў будзе дамагацца свайго. Я не бачу палітычнай волі, каб гэтыя канфлікты вырашаць за сталом перамоваў».

Каардынатар «Еўрапейскай Беларусі» Андрэй Саннікаў кажа, што не разумее да канца механізмаў Мытнага саюза. «Я за тое, каб стваралася зона свабоднага гандлю, але я не ведаю, ці не будзе Мытны саюз чарговай перашкодай для лібералізацыі гандлю і эканомікі».

«Прыбраць бар'еры ў стасунках з Расіяй вельмі важна, праз Мытны саюз ці не. Але прыярытэтам пры гэтым застанецца наша сяброўства ў Сусветнай гандлёвай арганізацыі», — тым не менш, Саннікаў не выключае магчымасці і такога ўтварэння.

Астатнія кандыдаты ў прэзідэнты ніяк не выказаліся па тэме. Алесь Міхалевіч больш актуальным для сябе лічыць кампанію «За кантроль і якасць алкаголю». Няма рэакцыі лідэра кампаніі «Гавары праўду!» Уладзіміра Някляева. Маўчаць Аляксандр Ярашук, Сяргей Гайдукевіч.

Як бачым, калі кандыдаты аднаго флангу свае пазіцыі акрэслілі, другія ўнікаюць адказу або адмоўчваюцца па гэтым прынцыповым пытанні геаэканамічнага выбару.

Зрэшты, маўчыць і сам Лукашэнка. Што таксама з'яўляецца рэакцыяй на падзеі. Дазволіў сабе выказацца толькі прэс-сакратар Лукашэнкі Павел Лёгкі. «Пажывем — пабачым», — двухсэнсоўна зазначыў ён.

**Зміцер Панкавец**

# Хто з іх Голум?

Да кампаніі дыскрэдытацыі Аляксандра Лукашэнкі ў расійскіх СМІ далучылася газета «Московский комсомолец» з артыкулам «Мінская разня тэлепілой».

У адрозненне ад папярэднікаў, яна не дае новага кампрамату. Проста дазваляе сабе пацягаць афіцыйны Мінск за вусы, апісаўшы яго рэакцыю на фільм НТВ «Хросны Бацька». На ілюстрацыі да артыкула — калаж з інтэрнэту. Выяўленая істота нагадвае гнюснага і хцівага персанажа фільма «Уладар пярсцёнкаў» — Голума. Калажыст упрыгожыў яго характэрнымі вусамі, гальштукам і подпісам «The Lord of Belarus».

Цікава, што ад самага з'яўлення культавага фільма паводле кнігі Толкіна ў інтэрнэце загаварылі пра падабенства Голума да іншага палітыка, таксама добра нам знаёмага, — Уладзіміра Пуціна. Расійскія патрыятычныя форумы кіпелі жаданнем падаваць у суд на стваральнікаў галівудскага фільма. Яны, маўляў, выкарысталі вобраз расійскага (тады яшчэ) прэзідэнта, каб стварыць такога непрыгляднага персанажа. Але аналогія прыжылася і размножылася ў калажах і шаржах.

Цяпер расійскія прапагандысты вырашылі скарыстацца праверaным прыёмам.

**Сяргей Мікулевіч**





# Вашай траве касец

### і іншыя пераможцы конкурсу беларускамоўнай рэкламы Adnak!

Большасць з тых, хто сочыць за гульнямі чэмпіянату свету па футболе, заўважылі рэкламны ролік маркі Ceresit, на якім зухаватыя мяшэчкі з будаўнічымі сумесямі гуляюць у футбол. Ролік прыкметны яшчэ і тым, што ён — беларускамоўны.

7 ліпеня ў Мінску падвялі вынікі Першага фестывалю беларускамоўнай рэкламы і прамоцыі Adnak! На конкурсе, зладжаным кампаніяй «Будзьма!» і інтэрнэт-парталам Marketing.by, абралі самыя ўдалыя рэкламныя ідэі году, створаныя на беларускай мове. Тут былі і вядомыя сотням тысячаў беларусаў відэаролікі, і нікому не вядомая рэклама — бо забароненая. Гаворка вядзецца пра макет рэкламнага шчыта, які Мінгарвыканкам не дазволіў да ўстаноўкі на вуліцах горада.

«Рэкламуючы паслугі, мы шукаем мову, якая будзе зразумелая найбольшай колькасці людзей. А калі мы спрабуем звузіць канал камунікацыі, дык рызыкуем застацца непачутымі. Уся справа ў грашах. Але паглядзеўшы працы фестывалю Adnak!, мы цяпер выдатна разумеем, што існуе немалая частка людзей, якая пачуе нас лепей і паставіцца да нас лепей, калі мы будзем гаварыць на іх мове», — кажа кіраўніца маркетынгавага аддзела кампаніі velcom Дзіна Цыбульская, якая была ў журы конкурсу.

Хто ж пераможцы? У намінацыі «Тэлевізійная і кінарэклама» перамог кіноролік Міхаіла Тумелі. Аўтар, вядомы сваімі мультфільмамі «Беларускія прымаўкі», гэтым разам у сваім выцінанкавым стылі рэкламаваў квас «Хатні». У намінацыі «Друкаваная і вонкавая рэклама» выйграў макет для рэкламнай абвесткі ў прэсе Bosch «Дзерці бульбу».

У намінацыі «Дызайн» (паштоўкі, календары, буклеты, лагатыпы) перамаглі нататнікі рэкламнай кампаніі Adliga «Натхняйся беларускім», на якіх спалучаюцца Джаконда і трактар МТЗ. У гэтай намінацыі былі адзначаныя таксама працы мастачкі Святланы Заскевіч. Яна рабіла буклеты для сваіх жа памятных манет «Святы і абрады беларусаў». А яшчэ — аформленая Ігарам Назарэнкам вокладка альбома «Белая яблыня грому» Лявона Вольскага і каляндар «Мастацтва футбола» — супольны праект «Альфа-банка», Беларускай федэрацыі футбола і беларускай зборнай. Аўтар рэкламнага календара — агенцтва «Францыск-груп».

У намінацыі «Этыкетка і ўпакоўка» першае месца не заняў ніхто. А вось другое дасталося серыі этыкетак для настоек «Маразуля» кампаніі «БЕЛПІ — Беларускае пітво».

Акрамя гэтага, у намінацыі «Радыёрэклама і аўдыёрэклама або ролікі для радыёэфіру і для эфіру ў гандлёвых залах» першае месца здабылі ролікі Кавярні «Камяніца» аўтарства рэкламнага агенцтва «Пінгвін». І наастатак, спецпрыз здабыла створаная, але нерэалізаваная кампанія, якая рэкламавала бензатрымер Ноуо. Аўтар — ІП «Лессервіз».

**Павал Касцюкевіч**



**Паводле стваральнікаў гэтай рэкламы бензатрымераў, агенцтва Publicis Hepta, Мінгарвыканкам не дазволіў вывесіць яе на білбордах. Не зразумелі слова «касец»?**



**У якасці бонуса распродажа кухонных камбайнаў — дыск для дранікаў.**



**«Белпі» працягвае агаломшваць рэцэптамі. «Маразуля» пасля «Крамбамбулі».**

# «Дзякуючы Грунвальду нас пачалі паважаць»

### Гісторык Юрый Бохан выдаў кнігу «Ваяры Грунвальдскай бітвы».



У выданні апісваюцца не толькі ваенныя падзеі, але і передгісторыя: ад пачатку экспансіі крыжакоў ва Усходняй Прыбалтыцы да прычынаў канфлікту між Ордэнам і ВКЛ. І, вядома, аўтар, які прафесійна вывучае сярэднявечную зброю, прысвяціў ёй не адну старонку кнігі. Гэтаксама як і ходу бітвы.

«Дзякуючы Грунвальду, мы зрабіліся еўрапейскай краінай, і не таму, што фізічна знаходзімся ў Еўропе, а таму, што да нас пачалі ставіцца як да роўных, — падсумоўвае Юрый Бохан. — Пасля Грунвальду Вялікае Княства Літоўскае зрабілася не аб'ектам тэўтонскай экспансіі, а суб'ектам еўрапейскай палітыкі».

Кніга адрасаваная шырокаму колу чытачоў – як стылем пісьма, лёгкім для чытання, так і колькасцю ілюстрацый. Аднак аўтар настойвае на тым, што выданне – навуковае. «Калі навукова-папулярнае выданне звычайна папулярызуе канцэпцыі, ужо агучаныя ў навуковых выданнях, дык я ў «Ваярах» прадстаўляю новыя навуковыя канцэпцыі, палемізую з іншымі аўтарамі, -- кажа Юры Бохан. – Ілюстрацыі? А чаму навуковае выданне не можа быць аздобленае ілюстрацыямі?»

У «Ваярах» чытач знойдзе здымкі гістарычных дакументаў, мапы, сярэднявечныя мініяцюры, рэканструкцыі замкаў, гербы і нават выявы тагачасных грошай. Дапамог з ілюстрацыямі выдання мастак Зміцер Герасімовіч, які аздабляў славутую «Краіну Беларусь».

**Лявон К**



**Бохан Юры. Ваяры Грунвальдскай бітвы.** — Мінск: «Беларусь», 2010

**Грунвальд поштай**

Выйшаў камплект паштовак «Грунвальдская бітва ў выявах», падрыхтаваны па матэрыялах фондаў Нацыянальнай бібліятэкі. У наборы 16 паштовак. Сярод іх — рэпрадукцыі гравюраў і палотнаў, сучасных і класічных. Каштуе набор блізу 11 тысяч рублёў.

КІНО

## Тома Круза — на аграсядзібу

### Хочаце, каб на вашу аграсядзібу хлынулі наведнікі? Зладзьце там здымкі фільма з Томам Крузам і Кэмеран Дыяс. Пра новы галівудскі фільм «Рыцар дня» піша **Ліза Кавальчык**.

Што рабіць, калі твая краіна страціла высокае другое месца па ўзроўні турыстычнай наведвальнасці? Калі твой курортны брэнд імкліва страчвае цану? Калі патэнцыйны кліент пераязджае на больш танныя курорты?

Адказ адзін — запрасіць Кэмеран Дыяс і Тома Круза і здымаць з іх удзелам фільм. Летась гарадскія ўлады Севільі, Кадыса ды іншых іспанскіх гарадоў зрабілі ўсё, каб заахвоціць галівудскіх рэжысёраў. Каб акторка з самай неверагоднай усмешкай у Галівудзе і вечна юны прыгажун пракаціліся менавіта па іх вузкіх вулках. Ачапілі паўгорада, вылучылі грошы з гарадскога бюджэту на здымкі.

Сюжэтам «Рыцар дня» нагадвае эпапею пра агента 007: ён — шпіён, яна — ягоная спадарожніца. Змаганне за тэхналагічную вынаходку, якая можа перавярнуць свет. Супраць іх — мафія. І на фоне — тут мы падыходзім да самай галоўнай часткі — гарадскія краявіды Севільі з сярэднявечнымі камяніцамі і карыдай, што надаюць прыгодам жаданы шарм і аб'ём.


**Самае галоўнае — за іх спінамі.**

Пакуль прадусары спадзяюцца, што стужка «Рыцар дня» зробіцца касаробам, улады Іспаніі мараць з яе дапамогай прывабіць процьму турыстаў. Яны не хавалі гэтага, інвестуючы ў фільм.

У Іспаніі, дзе турыстычная наведвальнасць знізілася на 3% толькі за апошні год, памятаюць прыклад Новай Зеландыі. Пасля эпічных сцэнаў трылогіі «Уладар Пярсцёнкаў», знятых на тамтэйшай натуры, турагенцтвы раптам прыгадалі пра існаванне гэтага зацішнага краю.

Пакуль турысты аддаюць перавагу таннейшым курортам Міжземнамор'я і Адрыятыкі, «Рыцар дня» нагадвае, хто галоўны ў турыстычным бізнэсе Еўропы. А каб стужка не зусім выглядала як агітка іспанскага турпрама, некаторыя сцэны здымалі ў заснежаным Зальцбургу. Для глыбейшага кантрасту.

Калі ў міжчассе вы засумавалі па Бонду, «Рыцар дня» — стужка для вас. І добрая нагода ўзважыць свой адпачынак у Іспаніі.

Самае галоўнае — гэта хвост. То бок фон!

## Сцісла

• **Мінкультуры паслала рыцараў на Грунвальд.** Міністэрства культуры прафінансавала ўдзел беларусаў у інсцэніроўцы Грунвальдскай бітвы. 194 прадстаўнікі беларускіх рыцарскіх клубаў накіраваліся ў Беласток для ўдзелу ў свяце «Канцэнтрацыя войск Вялікага Княства Літоўскага». Адтуль рыцары рушаць на Грунвальдскае поле, дзе 17 ліпеня адбудзецца інсцэніроўка вялікай бітвы.

• **Акцыя памяці паўстанцаў 1863 г.** Штогадовае ўшанаванне памяці паўстанцаў 1863—1864 пройдзе 25 ліпеня ва ўрочышчы Крыжы ля вёскі Малое Ольжыва (Лідскі раён). Заяўнік акцыі — Лідская гарадская арганізацыя ТБМ — плануе прыйсці на былое месца бою з расійскімі войскамі ды запаліць знічы ў гонар тых, хто змагаўся за нашу з вамі свабоду. Далучыцца да акцыі можа любы ахвотны.

• **Іна Афанасьева пакрыўдзілася на АМАП і ДАІ.** Спявачка выказала сваю незадаволенасць на прэс-канферэнцыі падчас «Славянскага базару». Па словах заслужанай артысткі Беларусі, за кулісамі сцэны Летняга амфітэатра яна сустрэла даўняга знаёмага, з якім даўно не бачылася, і з радасцю з ім абнялася. Супрацоўнік АМАПу зрабіў заўвагу, маўляў, гэта не месца для абдымкаў. Другі канфлікт адбыўся з адным з афіцэраў дзяржаўтаінспекцыі, які не дазволіў аўтамабілю спявачкі пад'ехаць па яе, затое прапусціў машыну, што пад'ехала па расійскага артыста.

МУЗЫКА

## Латушка: Фанаграме — вайна!

Беларускія артысты гатовыя сказаць «не» плюсавой фанаграме (запісу музычнага твора, які змяшчае запіс голасу выканаўцы).

Такая заява была зробленая на калегіі Міністэрства культуры. «Я буду змагацца з фанаграмай гарачым жалезам, буду яе выжываць, нашы музыкі павінны прывучацца спяваць ужывую», — падкрэсліў Павел Латушка, растлумачыўшы пры гэтым, што 60—70% твораў выконваюцца беларускімі артыстамі на канцэртах пад плюсавую фанаграму.

З міністрам пагадзіліся прысутныя на калегіі Ірына Дарафеева, Міхаіл Фінберг, Анатоль Ярмоленка, Іна Афанасьева, Аляксей Хлястоў.

**БЕЛТА**

# Правакацыя Вітаўта

Грунвальд: малавядомыя факты і абвяржэнне міфаў. Піша **Алесь Пілецкі**.

Кожная гістарычная падзея з часам абрастае міфамі. І чым больш часу мінае, тым больш гэтых міфаў. Бывае, рэальныя факты саступаюць ім месца ў падручніках. Асабліва калі справа тычыцца такіх значных падзей, як Грунвальдская бітва.

## Вайну пачалі не крыжакі

Мала хто ведае, што Вялікую вайну 1409—1411 гадоў (упершыню яе так назваў, дарэчы, польскі храніст Ян Длугаш) наўмысна справакаваў вялікі князь літоўскі Вітаўт. На той момант тэрыторыя Жмудзі — сучаснай заходняй Літвы — знаходзілася пад кантролем Тэўтонскага ордэна. І вясной 1409 Вітаўт падгаварыў жмудзінаў узняць паўстанне супраць крыжакоў.

Справа ледзьве не скончылася для Вялікага Княства Літоўскага фатальна. Вялікі магістр Ордэна Ульрых фон Юнгінген звярнуўся па дапамогу да Ягайлы. Ордэн прасіў караля Польшчы захаваць нейтралітэт у будучай вайне паміж крыжакамі і ВКЛ. Калі б Ягайла спакусіўся на прапанову, якая магла яму дазволіць у перспектыве дабіцца тэрытарыяльных і палітычных саступак ад аслабленага вайной ВКЛ, гісторыя Беларусі склалася б іначай.

## Дыпламатычная артпадрыхтоўка

Перад пачаткам ваенных дзеянняў абодва бакі імкнуліся дыпламатычнымі шляхамі перацягнуць на свой бок як мага больш саюзнікаў. Больш паспяховым у гэтым выявіўся крыжацкі ордэн. Юнгінгену ўдалося заручыцца падтрымкай венгерскага караля Жыгімонта Люксембургскага. На шчасце, толькі дыпламатычнай. Калі б вугорскія войскі абрынуліся на паўднёва-заходнія рубяжы ВКЛ і Кароны, Ягайлу з Вітаўтам прыйшлося б нясоладка. Усе сілы былі кінутыя на вайну з крыжакамі, рэсурсаў на «другі фронт» не было.

Абодва бакі актыўна карысталіся паслугамі наймітаў. На баку крыжакоў ваявалі рыцары з усёй Еўропы. Браты-саюзнікі таксама нанялі каля 3000 «гастарбайтэраў» — пераважна з Чэхіі і Маравы. Але былі і валанцёры, якія секліся з немцамі з ідэйных перакананняў. Сярод іх — будучы правадыр гусітаў Ян Жыжка. Менавіта на Грунвальдскім полі ён страціў сваё першае вока.

## Здрада наёмнікаў

Акрамя каронных і вялікакняскіх сіл ды татараў у склад арміі саюзнікаў уваходзілі малдаўскія і сербскія аддзелы. Агулам войска падпарадкоўвалася Ягайлу, аднак на справе каардынаваць і кантраляваць такую колькасць людзей было цяжка. Як піша Длугаш, непасрэдна перад бітвай такая разрозненасць вылілася ў адкрытае дэзерцірства. Пабачыўшы бліскучыя крыжацкія шэрагі, наёмныя чэшскія рыцары з харугвы Святога Юрыя паспрабавалі ўнікнуць бою. Гэта заўважыў падканцлер Кароны Ян Тронба і вярнуў здраднікаў на поле бітвы. Што праўда, ненадоўга: толькі ён адвярнуўся — наёмныя чэхі зноў уцяклі.

## Юнгінген браў Ягайлу «на слабо»

Грунвальдская бітва пачалася з тонкай правакацыі крыжакоў. Саюзнікі, нягледзячы на сваю колькасную перавагу, доўга не наважваліся на атаку. Крыжакі таксама не жадалі атакаваць першымі: іх было меней і, ударыўшы ў цэнтр войска саюзнікаў, яны маглі трапіць у пастку — палякі і ліцвіны замкнулі б флангі ў кола і высеклі ворагаў.

А тым часам ліпеньскае сонца неміласэрна смажыла крыжакоў у даспехах, якія стаялі на горцы. Ліцвіны ж з палякамі вычэквалі ў падлеску. Тады Юнгінген пайшоў на правакацыю: накіраваў у лагер Ягайлы падарунак — два аголеныя мячы. «Вялікі магістр Ульрых пасылае табе і твайму брату два мячы, каб вы разам са сваімі арміямі менш баяліся і змагаліся адважней, чым цяпер. А таксама каб больш не хаваліся па лясах і гаях», — гаварылася ў пасланні крыжакоў. Неўзабаве пасля гэтага Ягайла загадаў распачынаць бітву, якая скончылася для Юнгінгена так трагічна.

Тыя два мячы доўгі час захоўваліся ў Кракаве, у Вавельскім замку. Затым трапілі ў прыватную калекцыю Ізабэлы Чартарыйскай у Пулавы, а адтуль іх у часе падзелаў Рэчы Паспалітай вывезлі на ўсход расійцы. Дзе цяпер мячы Юнгінгена — невядома.

## «Уцёкі» ліцвінаў

Ці бегла з Грунвальдскага поля Вітаўтава войска? Згодна з пашыранай версіяй, атрады з ВКЛ пад кіраўніцтвам Вітаўта, наступаючы, трапілі ў воўчыя ямы і панеслі вялікія страты. Што і змусіла Вітаўта пасля далёка адступіць. За імі пагналіся крыжакі, а калі, не здолеўшы разбіць атрады з ВКЛ, вярнуліся на поле бою, засталі амаль поўны разгром асноўных сваіх сіл войскамі Кароны.

Насамрэч падрыхтаваць воўчыя ямы крыжакі наўрад ці маглі — яны падышлі да месца бітвы амаль адначасова з войскамі саюзнікаў, і такія іх дзеянні не засталіся б без увагі. А ўцёкі аддзелаў ВКЛ маглі быць добра спланаванай акцыяй, мэтай якой было падзяліць крыжацкую армію на дзве часткі.



Чэх Ян Жыжка — валанцёр пад Грунвальдам, наёмнік на баку англічан у Стогадовай вайне, слаўны правадыр гусітаў. Такім яго намаляваў Ян Матэйка.

## Гонар вялікага магістра

Калі вынік Грунвальдскай бітвы стаў зразумелы, магістру Тэўтонскага ордэна прапаноўвалі пакінуць месца падзей. Але ён адмовіўся. «Не дай Бог, каб я з'ехаў з поля бітвы, на якім загінула столькі адважных», — сказаў Ульрых фон Юнгінген. Вялікага магістра забіў шараговы ваяр, які, хутчэй за ўсё, і сам загінуў. Бо пра яго не захавалася ніякіх звестак. Крыжакі былі атачаныя і пераможаныя. Рэшткі войска закрыліся ва ўмацаваным лагеры. Ён неўзабаве быў узяты штурмам, і амаль усе яго абаронцы загінулі.

## Дабіваць крыжакоў было нявыгадна

Адна з найбольшых таямніц Грунвальдскай бітвы — чаму саюзнікі не далі рады ўзяць сталіцу пераможанай дзяржавы — Мальбарк. Каб гэта зрабіць, Ягайлу з Вітаўтам было дастаткова пратрымаць аблогу некалькіх месяцаў. Аднак войскі прастаялі пад сценамі толькі некалькі дзён.

Агульнапрынятая версія — ваяры хацелі хутчэй вярнуцца дадому, бо якраз ішло жніво, трэба было парадкаваць ураджай. Аднак у выпадку здабыцця Мальбарку кожны з ўдзельнікаў штурму атрымаў бы частку крыжацкіх багаццяў, якія шматкроць пераважылі б каштоўнасць ураджаю.

Відаць, прычына хавалася ўсё ж у супярэчнасцях між пераможцамі. Паводле адной версіі, падчас бітвы большыя страты панеслі войскі ВКЛ. Ягайла, у якога адносіны з Вітаўтам і так былі напружаныя, мог адмовіцца ад развіцця свайго поспеху, каб захаваць унію ВКЛ і Кароны. Такім чынам, Грунвальдская бітва ледзьве не стала прычынай разрыву гістарычнага хаўрусу між дзвюма краінамі.

Паводле іншай версіі, Вітаўт не хацеў знішчаць канчатова трэці «цэнтр сілы» ў рэгіёне, каб не застацца сам-насам з палякамі і Ягайлам.

## Цень Грунвальду

У 1914 годзе, падчас Першай сусветнай вайны, нямецкая армія ізноў стаяла на Грунвальдскім полі. Маршал Гіндэнбург, які камандаваў нямецкімі аддзеламі, сказаў генералу Людэндорфу, што бітва ў жніўні 1914 будзе шанцам узяць рэванш за 1410 г. Немцы сапраўды перамаглі праз пяцьсот гадоў пасля Грунвальду.

Падчас Другой сусветнай вайны паражэнне ад войск саюзнікаў у ліпені 1410 выкарыстоўвалася нямецкай прапагандай як матывацыя для паходу на Польшчу. Савецкая прапаганда малявала бітву як паўстанне славянаў супраць германскай агрэсіі. Між тым этнічная прыкмета ў далёкім 1410-м грала малую ролю: у крыжацкіх харугвах хапала славянскіх і балцкіх ваяроў з падуладных тэрыторый, у шэрагах саюзнікаў змагаўся стракаты інтэрнацыянал з найманых еўрапейскіх рыцараў. Відавочна адно: Грунвальд быў такой буйной падзеяй еўрапейскай гісторыі, што яго грукат дакаціўся да нашага часу праз шэсць стагоддзяў.



Адна з першых выяваў Грунвальдскай бітвы: мініяцюра са швейцарскай ілюстраванай хронікі Luzerner Schilling (1515).

## Праграма святочных мерапрыемстваў 600-годдзя Грунвальдскай бітвы

15 ліпеня спаўняецца 600 гадоў з дня перамогі беларуска–польска–літоўскіх войскаў над Тэўтонскім ордэнам. З гэтай нагоды на полі, што на поўначы Польшчы, 17 ліпеня адбудзецца вялікая інсцэнізацыя бітвы, а таксама спадарожныя мерапрыемствы — парады сярэднявечных ваяроў, канцэрты, народныя гулянні і рыцарскія баі.

**15 ліпеня (чацвер)**

**16.00** — прыбыццё караля Уладзіслава Ягайлы і Вялікага магістра Ульрыха фон Юнгінгена з коннымі харугвамі на Грунвальдскае поле (пачатак, прадстаўленне ўдзельнікаў, уручэнне грамат).

**17.00** — конны рыцарскі турнір, рэпетыцыі.

**16 ліпеня (пятніца)**

**10.00** — сярэднявечныя народныя гулянні і кірмаш, турніры, рыцарскія гульні і забавы ў рыцарскім лагеры.

**18.00** — канцэрты фольк–музыкі

**22.00** — супольныя забавы на свежым паветры

**17 ліпеня (субота)**

**10.00** — палявое набажэнства

**14.00** — інсцэніроўка Грунвальдскай бітвы

**16.00** — фестываль фольк–музыкі

**22.00** — фестываль агню



# Расійскія супершпіёны і пасля 10 гадоў жыцця ў ЗША размаўлялі з моцным акцэнтам

Нью-ёркскі суд выдаў ордэр на дэпартацыю з ЗША дзесяці расійскіх шпіёнаў. Раней яны прызналіся ў незаконнай дзейнасці на карысць Расіі. У абмен на іх вызваленне Масква выпусціла чатырох чалавек, абвінавачаных у шпіянажы на карысць Захаду.

Самалёт з пяцццю мужчынамі і пяцццю жанчынамі вылецеў з Нью-Ёрка праз некалькі гадзін пасля загаду суддзі аб дэпартацыі. Абмен адбыўся ў Вене — гэтай нейтральнай зоне ўсіх разведак свету.

Адвакат адной з агентак, Вікі Пелаэс, кажа, што прадстаўнікі Расіі абяцалі ёй пажыццёвыя выплаты памерам у $2000, бясплатнае жыллё ў Расіі і пакрыццё ўсіх выдаткаў на наведванне дзяцей. Пелаэс, аднак, вырашыла вярнуцца ў роднае Перу. Перуанскі міністр замежных справаў Хасэ Антоніё Гарсія сказаў, што Пелаэс не ўчыніла ў яго краіне ніякіх злачынстваў і будзе «разглядацца як і любы іншы грамадзянін краіны».

Афіцыйна ўрад ЗША не абвінавачваў агентаў у шпіянажы. Яны былі абвінавачаны ў незарэгістраванай дзейнасці ад імя замежнай дзяржавы, за якую ім пагражала пяць гадоў пазбаўлення волі.

Усе агенты перад судом у Нью-Ёрку прызналіся ў здзяйсненні злачынстваў. Нягледзячы на дзесяць гадоў жыцця ў ЗША, у судзе яны гаварылі з моцным расійскім акцэнтам. Гэты факт, як і малапрадуктыўная дзейнасць шпіёнаў на працягу дзесяцігоддзя — амерыканскія спецслужбы доўгія гады адсочвалі кожны іх крок, — выклікаюць вялікія сумневы ва ўзроўні сучаснай расійскай разведкі.

У дзесяці расійскіх шпіёнаў канфіскаваная ўся маёмасць і грашовыя сродкі. У абмен на вызваленне дзесяці расійскіх агентаў Масква вызваліла чатырох чалавек. Гэта навуковец Ігар Суцягін, былы палкоўнік вайсковай выведкі Сяргей Скрыпаль, былы агент замежнай разведкі Расіі Аляксандр Запарожскі і былы афіцэр КДБ Анатоль Васіленка. Усе яны былі памілаваныя прэзідэнтам Мядзведзевым, але спачатку ім давялося прызнаць сваю віну.

**Сяргей Гезгала; КаМ**




**Былы муж-англічанін расійскай агенткі Эн Чэпмэн (сапраўднае імя невядомае) раскрыў шмат падрабязнасцяў інтымнага жыцця шпіёнкі.**

КАХАННЕ І СЭКС

# SMS і мэйлы як люстэрка адносін

Паміж радкамі sms можна расчытаць не толькі рысы характару вашага каханага, але і яго стаўленне да вас, кажуць псіхолагі. Варта толькі звярнуць увагу на некаторыя дэталі.

### «Безназоўнае»

Смску, якая пачынаецца са слоў «Мілы(-ая)», «Дарлінг» ці нават «Адзіны(-ая)», зручна рассылаць па ўсім спісе кантактаў. Таму не ўскладайце вялікіх спадзяванняў на партнёра, што аддае перавагу такому звароту. Калі вы пакуль яшчэ «проста знаёмыя», а ён ужо называе вас не меней як «пуся», то, хутчэй за ўсё, вы маеце справу з асобай лёгкіх паводзінаў, якая прагне адносін без абавязкаў. Такі чалавек спрабуе зачараваць усё, што рухаецца, «на ўсялякі выпадак». Будзьце асцярожнымі, у гэтым выпадку вы — не мэта, а сродак для самасцвярджэння.

### Засілле смайлаў

У прынцыпе, смайлы ў смсках, скайпавых паведамленнях і электронных лістах — годная замена кропкам ды коскам. Яны не толькі б'юць тэкст на сэнсавыя кавалкі, але яшчэ і няблага перадаюць эмоцыі. У смайлах няма нічога заганнага, калі толькі іх колькасць не «зашкальвае». Бо гэта значыць, што вам «пашанцавала» адхапіць «вялікае дзіця» — незалежна ад таго, які год нараджэння стаіць у ягоным пашпарце.

### Залішняя педантычнасць

Ваш партнёр старанна расстаўляе ўсе знакі прыпынку і не выкарыстоўвае скарачэнняў? Пашыраная з'ява сярод педантаў ды занудаў, для якіх галоўнае — навучыць жыццю ўсіх навокал. Вам вырашаць, ці варта згаджацца на чыста фармальныя патрабаванні (а іх будзе ну вельмі шмат!) у абмен на добрасумленнасць і надзейнасць, уласцівыя такому чалавеку.

### Процьма клічнікаў

Падчас асабістай сустрэчы гэтыя асобы часам паводзяць сябе досыць халодна. І толькі падчас дыстанцыйных стасункаў іх паведамленні міжволі выдаюць сакрэты гаспадароў. За падкрэсленай стрыманасцю часта хаваюцца вельмі пяшчотная душа і мноства самых розных эмоцый.

### Напусціць туману

Нягледзячы на ўсе вашы смс-намаганні даведацца хоць нешта канкрэтнае пра вашага сябра (сяброўку) — у адказ не чытаеце амаль нічога, апроч смешачак ды сустрэчных пытанняў. Жаданне напусціць туману ды таямнічасці ў адносіны з галавою выдае залётнікаў, цвёрда ўпэўненых, што праціглеглы пол вар'яцее ад іх рамантычных таямніцаў. Такім чынам яны спрабуюць павысіць свой рэйтынг.



### Такое доўгае чаканне

Не спяшайцеся меркаваць, што ваш партнёр зусім абыякавы да вас, калі не атрымліваеце адказ на смску ў наступную ж секунду. Магчыма, ён не спяшаецца адказваць, бо ўпэўнены, што гэта надасць яму VIP-статус. Праўда, іншая падстава выглядае не гэтак весела. Калі ён, атрымаўшы вашае паведамленне, спачатку робіць «важнейшыя» справы і толькі потым узгадвае пра адказ, задумайцеся, ці трэба вам такі «нетаропкі» прыхільнік.

І ўсё ж, як лічаць эксперты, галоўны паказальнік узаемнай зацікаўленасці партнёраў адно ў адным — своечасовы пераход ад смс-перапіскі да камунікацыі ўжывую.

**Ганна Котка**

КОЛЫ

## На тэрыторыю Беларусі забаронены ўвоз б/у шын

Увоз былых ва ўжыванні шын на тэрыторыю краін Мытнага саюза (акрамя запаснога кола да транспартнага сродку) забаронены. Гэта прадугледжана пагадненнем паміж краінамі мытнай тройкі. Раней дапускаўся бязмытны ўвоз у Беларусь чатырох б/у шын кожнай машынай.

**Afn.by**

## Еўрасаюз ухваліў продаж Volvo кітайцам

Кітайскі холдынг Zhejiang Geely набывае шведскага аўтавытворцу.

Як палічылі ў Еўракамісіі, аб'яднанне кампаній не прынясе сур'ёзнай шкоды іншым гульцам аўтарынку. Сума ўгоды склала $1,8 млрд.

Фірма Volvo лічыцца стратнай з 2006. У 2009 яе страты склалі $1,4 млрд.

Geely плануе інвеставаць у Volvo $900 млн. На думку кіраўніцтва кітайскай кампаніі, гэтае грашовае ўліванне павінна «вярнуць Volvo да жыцця» і ўсяго за два гады ператварыць стратны брэнд у прыбытковы. Для гэтых мэтаў у Кітаі будзе пабудаваны завод магутнасцю 300 тысяч аўтамабіляў у год.

**СМ**

# Навукоўцы назвалі
## мужчынскія недахопы, якія падабаюцца жанчынам

Даследчыкі склалі спіс асаблівасцяў мужчын, якія ім самім здаюцца недахопамі, а жанчынам, якраз наадварот, вельмі падабаюцца.

Так, жанчыны схільныя лічыць прывабным пах мужчынскага поту (праўда, толькі свежага, а не застарэлага).

Спецыялісты ведаюць, што ў складзе поту ёсць андрастадыянон, які і выклікае сэксуальнае ўзбуджэнне. 72% апытаных жанчын вельмі цэняць мужчынскую сівізну і лічаць яе пікантнай.

Шнары, вядома ж, упрыгожваюць мужчыну. Жанчыны падсвядома лічаць іх прыкметай мужнасці і адвагі. Цікава, што жанчынам няважна, з якой прычыны з'явіліся шнары.

Як ні дзіўна, жанчынам падабаюцца мужчыны ў акулярах, якія ў іх вачах вылучаюцца розумам і інтэлігентнасцю. Ім жанчыны больш давяраюць.

**startcomments7d.org.ua**

ТЭХНАЛОГІІ

## Расія спусціла на ваду плывучую АЭС

Праз 40 гадоў пасля амерыканцаў.

Першая з серыі плывучых атамных электрастанцый «Акадэмік Ламаносаў» была спушчаная на ваду ў Санкт-Пецярбургу.

АЭС увядуць у эксплуатацыю ў 2011, яна будзе складацца з двух рэактараў KLT-40 на 35 мегават, каб забяспечыць да 70 МВт электраэнергіі (і 270 МВт цеплавой энергіі). Гэта рэактары з вадой пад ціскам, якія лічацца вельмі бяспечнымі (аварыя такога рэактара адбылася толькі раз і абышлася без ахвяраў). Рэактары KLT-40 выкарыстоўваюцца расійцамі ўжо доўгі час на атамных ледаколах класа «Арктыка» і «Таймыр». На пабудаваных у Расіі плывучых АЭС яны будуць устаноўлены на судны даўжынёй 144 метры і водазмяшчэннем 21500 тонаў. Да 2015 году павінна быць пабудавана прынамсі 7 такіх рэактараў.

Першая плывучая АЭС у свеце — MH-1A — была пабудаваная ў 60-х для Арміі ЗША і пастаўляла да 10 МВт энергіі ў зоне Панамскага канала з 1968 па 1975. Потым Злучаныя Штаты вырашылі адмовіцца ад выкарыстання плывучых АЭС пад ціскам эколагаў. Аднак калі глядзіш на нафту, што залівае ўзбярэжжа Луізіяны, або чытаеш пра 230 ахвяраў пажару грузавіка, які перавозіў паліва ў Конга, знікае ўпэўненасць, што адмова ад атамнай энергіі разумная. Расійцы сцвярджаюць, што нават у выпадку затаплення судна пагрозы экалагічнай катастрофы няма, дзякуючы браніраванай паверхні рэактара. KLT-40 — такі самы рэактар, як той, што знаходзіўся на борце атамнай падводнай лодкі «Курск», якая патанула 10 гадоў таму. Пасля катастрофы рэактар быў выцягнуты на паверхню і адбуксаваны да ваенна-марской базы, дзе з яго было выпампавана паліва.

**КаМ: паводле gazeta.pl**

ЕЖА

## Шварцэнегер і курэй абароніць

Губернатар Каліфорніі Арнольд Шварцэнегер падпісаў закон, які акрэслівае патрабаванні да якасці курыных яек. З 1 студзеня 2015 на тэрыторыі штата крамы змогуць прадаваць толькі тыя яйкі, якія знеслі «шчаслівыя куры».

У тэксце закону сказана, што курыца павінна знаходзіцца ў камфортных умовах: каб клетка была досыць вялікая, каб курыца магла распрастваць крылы і мела магчымасць ляжаць. Грамадскасць палічыла прынцыпе дадзенага закону магчымасцю абараніць правы жывёлаў і даць спажыўцам прадукцыю высокай якасці.

**Los Angeles Times**




**Басовішча**

**16—18 ліпеня ў лесе пад Гарадком (Беласточчына)** пройдзе фестываль музыкі маладой Беларусі «Басовішча-2010». Будуць **«Тройца»**, **«Гурзуф»** і **«Адыс Абеба»**, упершыню планує ўзяць удзел **«Ляпіс Трубяцкой»**.

## КАНЦЭРТЫ

**Зміцер Вайцюшкевіч**

**20 ліпеня а 19-й у Малой зале к/з «Мінск»** адбудзецца традыцыйны летні канцэрт Змітра Вайцюшкевіча з нагоды дня народзінаў артыста. У праграме: найлепшыя і новыя песні, выступ сяброўмузыкантаў, песні, і паэзія, і прыемныя неспадзяванкі!

**Neuro Dubel**

**22 ліпеня а 20-й у Jolly Roger Cafe (вул. Талбухіна, 4)** — Neuro Dubel.

## ФУТБОЛ

**Стартуе Ліга чэмпіёнаў**

**У сераду 14 ліпеня** старт у Лізе чэмпіёнаў возьме барысаўскі БАТЭ. Дома беларусы ў рамках другога кваліфікацыйнага раўнду турніру прымуць ісландскага чэмпіёна клуб «Хабнарф'ёрдзюр». **Пачатак сустрэчы а 19:00.** Цікава, што тры гады назад гэтыя каманды ўжо сустракаліся ў Лізе чэмпіёнаў. Па суме двух матчаў БАТЭ прайшоў далей. За тыдзень барысаўцы згуляюць у Ісландыі.

**Працяг Лігі Еўропы**

**15 ліпеня** мінскае «Дынама» прыме дома эстонскі «Калеў». Гэта другі кваліфікацыйны раўнд Лігі Еўропы. **Пачатак а 19:00 на стадыёне «Дынама».** Білеты ад 5 да 15 тысяч рублёў. У гэты ж дзень яшчэ дзве беларускія каманды згуляюць у гасцях. Жодзінскае «Тарпеда» ў Бялградзе падужаецца з мясцовым ОФК, а магілёўскі «Дняпро» ў прыгарадзе Осла Бекестуа — з нарвежскім «Стабекам». Матчы ў адказ за тыдзень.

## ВЫСТАВЫ

**«Грунвальд за смугою часу»**

600-гадовы юбілей Вялікай Перамогі прынёс новыя творы і новае таленавітае прачытанне дзвюх важных тэм у нашай айчыннай гісторыі. **У Літаратурным музеі Багдановіча (вул. Багдановіча, 7а) да 1 жніўня** працуе выстава, прымеркаваная да гадавіны Грунвальду.

## ІМПРЭЗЫ

**Уладзімір Стэльмах**

**Музей гісторыі тэатральнай і музычнай культуры (зав.Музычны, 5) 15 ліпеня а 15-й** запрашае на сустрэчу-ўспамін, прысвечаную дзеячу мастацтваў Уладзіміру Стэльмаху. Сёлета яму споўнілася б 100 гадоў. Вядучы сустрэчы — доктар мастацтвазнаўства Анатоль Сабалеўскі.


ЮРАСЬ МАЛАШ. РАЙ. КАВАЛЬ

**Незвычайны мастак**

**22 ліпеня а 19-й у кнігарні «Ў» (пр.Незалежнасці, 37а)** адбудзецца прэзентацыя кніг мастака Юрася Малаша. У праграме — прэзентацыя кніг, аўтарскі слайд-фільм, паштоўкі Юрася Малаша з каліграфічнымі пажаданнямі і прыемная неспадзеўка.

**Дах-XI**

**Да 15 жніўня ў Палацы мастацтва** праводзіцца фестываль эксперыментальнага мастацтва «Дах-XI» пад назвай «Mageia Cerebrum» («Цёмныя таямніцы Мозгу»).

**Праграма фестывалю:**

**15 ліпеня**

Канцэрт: **«Гарынь»**, **«Няміга»**, **«ESSA»** — містэрыя, **«GUDA»**.

Праект **«Філаматы-Філарэты»** (Аляксей Жбанаў і сябры).

**16 ліпеня**

**16.00—19.00** — Польскае кіно: «Filmowe Podlasie atakuje» vol. 7.

**19.00—22.00** — Канцэрт: **Сяргей Летаў**, **«Мінус Іван»** (Расія), **«Князь Мышкін»**, **«Рацыянальная Дыета»**, кампазітар **Вячаслаў Кузняцоў** і гурт **«Свінцовыя Аблокі»** (музычны перформанс).

**17 ліпеня**

**16.00—18.00** — Міжнародны фестываль кароткаметражнага кіно «ZubrOFFka».

**19.00—22.00** — Канцэрт: Intouch прэзентуе: літаратурна-музычная імпрэза: «Гучныя строфы». **Дзмітры Плян**, **Пшанічны**, **Уладзіслаў Бубен**, **Наста Лабада**, **«Roomdark»**, **Аляксей Талстоў** ды іншыя.

**18 ліпеня**

**16.00—18.00** — Workshop Second Hands (новае жыццё выкінутай паперы).

**18.30—22.00** — Канцэрт: **«Планетарый»** (Гомель), **«Механічныя Апельсіны»** (Мінск), **«Чарнавар»** (Вілейка), **«Мамчыны пацеркі»** (Мінск).

**19 ліпеня**

**16.00—19.00** — Украінскае кіно: Міжнародны кінафестываль візуальнага мастацтва «Wiz-Art».

**19.30—21.00** — Спектакль «Dostoevskij coming back» Кабарэ Матыльды Штор.

**20 ліпеня**

**14.30—22.00** — Украінскае кіно. Дакументальны фільм «Вялікія філосафы свету. Спіноза», мастацкі фільм «Кастынг».

**19.00—22.00** — Канцэрт: **Тэатр псіхічнай неўраўнаважанасці** (перформанс)+ **Planet N** (sound), **Kritchev vs Ban**.

**21 ліпеня**

**20.00—22.00** — Літаратурная вечарына выдавецтва «Галіяфы». Канцэрт: **«Умка і Браневічок»** (Расія).

**22 ліпеня**

**16.00—17.00** — Расійскае кіно: Дыпломныя работы Дзяржаўнага санкт-пецярбургскага ўніверсітэта кіно і тэлебачання.

**17.00** — Лекцыя «Праблемы сучаснага маладзевага кіно».

**20:30** — Фільм «Бездань».

**20.00—22.00** — Канцэрт: **Re123**.

**23 ліпеня**

**15.00** — Беларускае кіно: By D.I.Y.-video за 5 гадоў.

**16:30** — Дэбаты. «Маладое кіно. Мэта — Рух».

**19:00** — рэжысёр В.Рубінчык, «Вянок санетаў», 1973 г.

**19.00—22.00** — Канцэрт: **«Machine Communication»** (EBM-Dark Industrial).

**18.00—19.00** — Свабодны тэатр (Брэст) — «ЗваніцьЛётаць» (паводле Д.Хармса).

**24 ліпеня**

**19.00—22.00** — Канцэрт: **«Machine Communication»** (EBM-Dark Industrial).

**25 ліпеня**

**18.00—22.00** — Канцэрт: **«Dzivasil»**, **«Des Mefodij»**, **«Uvhiol»**, **«TM»**, **«TomSpectral»** (Брэст), **VJ Plaha**.

**26 ліпеня**

**19.00—20.30** — Беларускае кіно: сустрэча з рэжысёрам Уладзімірам Марозам, фільмы «Пад крылом Анёла», «Міфалагемы Родзіна».

**18.00—22.00** — Канцэрт **«За жыццё!»**, **«ПаЦі»**, **«Старыя Трокі»**, **«Д.Хармс»**, тэатр **«Тар-Тар»**, **«Grind Out»**.

**27 ліпеня**

**18.00—22.00** — Канцэрт: **«Rasol-Rasolniks»**, **«Marimana»** (Латвія), **Lena Lectra** (Мінск), **«Uncou»** (Мінск).

**28 ліпеня**

**18.00** — Круглы стол «Фотавыстава».

**19.00—22.00** — Канцэрт: **«Amaroka»**, **«Blagi Mat»**, **«Краджа Золата»**.

**29 ліпеня**

**18.00—22.00** — Канцэрт: **«Ritual Dub»**, **«VoKal»**, **«Han Ahiniem»**, **«Пленер»**, **«Кватэра FM»**, **«БугіДо»**.

**30 ліпеня**

**18.00—18.45** — Тэатр «Eye»: «Настрой Ч».

**19.00—22.00** — Канцэрт: «Новы План» — **Andrejko**, **Uncou**, **L.Beat**, **Drug**, **Bogdan**, **JDPS**, **Sandman**, **Glebluv**, **Techo**.

**31 ліпеня**

**18.00—22.00** — Канцэрт: **«Pogost»** (Гродна), **«May_b_ project»** (Гродна), **«Дзеці Неба»** (Гродна), **«Нойзаў Каўчэг»** (Мінск—Гродна).

**1 жніўня**

**18:00—22:00** — Канцэрт: «Sun Technique» — **«Nextspace»**, **Fatalsnipe**, **«CJclip»**, **«Inkognetto»**.

**2 жніўня**

**18.00—20.00** — Творчая сустрэча з скульптарам Даніэлем Людвічуком.

**19.30—22.00** — Канцэрт: **«Магма»**, **«Winter War in Tibet»**, **«Children of Ishizuke Tee»**, **«Сакрэтны праект»**.

**3 жніўня**

**18.00—22.00** — Вечар, прысвечаны Чэславу Немену. Лекцыя неменазнаўцы Эдварда Хоміча, музыка, відэапраекцыя. Тадэвуш Склінскі — аўтар кнігі пра Немена.

**4 жніўня**

**17:00** — Лекцыя: Мечыслаў Скалімоўскі — «Перформанс у «Галерэі Падляскай», перформанс Лукаша Главацкага.

**19.00—22.00** — Канцэрт: **«Re1ikt»**, **«Караван»**, **«Hair Peace Salon»**, **«Людзі Горада М»**.

**14 і 15 жніўня**

Гурт **«Verba!»** (Расія).

## ТЭАТРЫ

**15 ліпеня**

**Тэатр імя Горкага** — «Ідэальны муж»

**Купалаўскі тэатр** — «Translations»

**16 ліпеня**

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Палёты з анёлам»

**Купалаўскі тэатр** — «Translations»

**Тэатр імя Горкага** — «Распуснік»

**17 ліпеня**

**Тэатр імя Горкага** — «Адзіны спадкаемца»

**18 ліпеня**

**Тэатр імя Горкага** — «Свабодны шлюб»

**Купалаўскі тэатр** — «Пінская шляхта»

**19 ліпеня**

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Нязваны госць»

**Купалаўскі тэатр** — «Пінская шляхта»

**20 ліпеня**

**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Дзікае паляванне караля Стаха»

**21 ліпеня**

**Купалаўскі тэатр** — «Не мой»

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Адамавы жарты»

**22 ліпеня**

**Купалаўскі тэатр** — «Не мой»

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Адамавы жарты»

**23 ліпеня**

**Купалаўскі тэатр** — «Паўлінка»

**Тэатр імя Горкага** — «Эсфір»

**24 ліпеня**

**Тэатр імя Горкага** — «Эсфір»

**25 ліпеня**

**Купалаўскі тэатр** — «Чорная панна Нясвіжа»

**Тэатр імя Горкага** — «Пакінутая жанчына (Мачаха)»

## КІНО

### Яшчэ адзін аватар

**Уладар стыхій** (The Last Airbender)

ЗША, 2010, каляровы, 103 хв.

Жанр: Фэнтэзі

Адзнака: 4 (з 10)

Чатыры народы Вады, Агню, Паветра і Зямлі жылі ў згодзе, пакуль людзі Агню з дапамогай машынаў не пачалі войны. Землі і плямёны акупаваныя. Але нечакана з'яўляецца маленькі хлопчык — Аватар, здольны кіраваць усімі стыхіямі. Разам з новымі сябрамі герой вучыцца магіі і становіцца душой паўстання.

Карціна індуса Найта Ш'ямалана, пастаўленая паводле анімэ-серыялу, — фантазія па матывах будыйскіх міфаў і магіі. Абранае дзіця са звышнатуральнымі здольнасцямі, баявыя агонь і вада, магія паветра, чароўны цмок у якасці духоўнага настаўніка...




Прыёмы кунг-фу, бойкі, стракатыя дэкарацыі. Магія ў чарговы раз змагаецца з тэхнікай. Аватары ізноў ідуць у наступ.

Ноа Рынгер атрымаў галоўную ролю, дасланую рэжысёру відэа з уласна выкананымі прыёмамі таэквандо. Гэта адзінае, што варта паглядзець.

**Андрэй Расінскі**

# Вітаўтаманія як працяг радзівіламаніі

Што супольнага ва Усяслава Чарадзея, князя Вітаўта і дынастыі Радзівілаў? Правільна, усе яны — гандлёвыя маркі.

Запамінальная назва — брэнд — заваёўвае кліентаў і дапамагае запомніць тавар.

У Беларусі брэндавы маркетынг развіўся ў сярэдзіне 90-х. З'явіўся попыт і на беларускія словы і назвы, у прыватнасці на імёны гістарычных постацяў. Першай ластаўкай стаў «Усяслаў Чарадзей», элітная марка гарэлкі. Каб падкрэсліць адметнасць, быў зроблены адмысловы дызайн бутэлькі. У дадатак, яна стала першай ёмістасцю сярод алкагольных напояў беларускай вытворчасці, што дазваляла наліваць напой парцыйна, па-барнаму.

Праўда, да «Чарадзея» былі і іншыя «гістарычныя» назвы. Напрыклад, пладовае віно, названае ўжо ў гонар прабабулі Чарадзея, Рагнеды. Брэндам той прадукт назваць цяжка — вытворцы, пэўна, найменш думалі пра развіццё маркі і якасць. Віно знікла ў час чарговай хвалі перайменаванняў, якія гэтак любяць нашы вінзаводы. Аднак на Барысаўшчыне пітушчых жанчын дагэтуль клічуць «рагнедамі».

У тым самым Барысаве выпускалі і маянэз «Купалаўскі». Сёй-той нават абурыўся: як можна прыніжаць гонар нацыянальнага паэта. Журналіст тады запытаўся ў Някляева, аўтара песні «Янка Купала»: а Вам спадабалася б есці аліўе пад маянэзам «Някляеўскі»? Галоўнае, каб маянэз быў добры, адказаў тады паэт.

Некалькі гадоў таму ў Беларусі спрабавалі рабіць гарэлку «Шагал». Аднак сваякі мастака, у адрозненне ад нашчадкаў Усяслава Полацкага, не звязліся і падалі на вытворцу ў суд. Вытворчасць «Шагала» давялося згарнуць. Хаця дадамо, што ў суседняй Польшчы ўжо колькі гадоў беспярэшкодна робіцца гарэлка «Шапэн», і частка прыбыткаў ад яе продажу ідзе ў культурны фонд імя кампазітара.




АЛЕСЬ ЧЫГІР

**Новыя павевы ў эналогіі: разам з паваротам краіны на Захад на прылаўках з'явілася пладова-ягаднае «Еўрапейскае» віно.**

Узялі ў маркетынгавы абарот і некаранаваных каралёў Беларусі — знакамітых род магнатаў Радзівілаў. На прылаўках з'явіліся дасканалы чорны хлеб «Радзівілаўскі», віно Radzivill. Паўсталі «радзівілаўскія» гандлёвыя цэнтры, рэстараны і сетка супермаркетаў. З навінак радзівіліяды — мінеральная вада «Радзівілаўская» і сок вытворчасці Клецкага кансервавага завода са слоганам на пачку: «У найлепшых традыцыях Радзівілаў». Клецк і сапраўды некалі належаў гэтай славутай сям'і. Пытанне ж наяўнасці апельсінаў у старадаўнім Клецку тактоўна абмінем.

Яшчэ адно слаўнае імя гісторыі — Вітаўт. Першай ластаўкай была ружовая шампань «Князь Вітаўт», выпушчаная Мінскім заводам ігрыстых вінаў. З'явілася яна, відаць, з меркаваннямў шматвектарнасці, адначасова з «Московской Златоглавой». І вось цяпер — калі ласка: па маршрутах Вільні будзе хадзіць «Вітаўт», беларускі тралейбус.

Пакуль сярод сотні самых моцных беларускіх брэндаў, паводле версіі агенцтва MPP Consulting, імёнаў гістарычных асобаў няма. Аднак рэкламіст Андрэй Гнёт лічыць, што называць тавары знакавымі назвамі беларускай гісторыі — прыбыткова. Маркі, што падымаюць на шчыт тое ці іншае гістарычнае імя, вылучаюцца незвычайнасцю на айчынных і замежных рынках. У дадатак Андрэй Гнёт нагадвае, што называнне прадуктаў імёнамі нацыянальных герояў важнае для нацыянальнага ўсведамлення. «Дзіця, якое прачытала назву «Вітаўт» на бамперы МАЗа ці тралейбуса, будзе патрабаваць ад бацькоў тлумачэння, хто ён такі, — кажа Андрэй Гнёт. — І бацькам давядзецца нешта казаць».

**Павал Касцюкевіч**

# Пра што не варта пісаць Vkontakte і на «Аднакласніках»

Спіс тэмаў, якія лепей не закранаць у сацыяльных сетках.

### Яўкі і паролі

Сацыяльныя сеткі выкарыстоўваюцца не толькі для зносін, але і для захоўвання і абмену сакрэтнымі дадзенымі. Прычым некаторыя карыстальнікі могуць выставіць на ўсеагульны агляд пароль і ад самой сацыяльнай сеткі. Таму асабліва наіўным раяць адразу ж змяніць пароль пасля таго, як ён трапіў у чыюсьці чужую скрыню.

### Дзявочае прозвішча

Нельга не згадаць і пра кодавыя словы, якія выкарыстоўваюцца для аднаўлення забытага пароля. Не сакрэт, што самымі папулярнымі з кодавых пытанняў з'яўляюцца альбо дзявочае прозвішча маці, альбо нумар школы. Менавіта з гэтай прычыны карыстальнікаў, якія жадаюць даць пра сябе як мага больш інфармацыі, перасцерагаюць ад афішавання прозвішчаў сваякоў і нумароў навучальных установаў.

### «Сцяна» ганьбы

Наступнымі ў спісе забароненых дзеянняў у сацыяльных сетках апынуліся публікацыі паведамленняў асабістага характару на так званай «сцяне». Не трэба забываць пра тое, што шэдэўры на «сцяне» бачыць не толькі атрымальнік, але і іншыя карыстальнікі. Таму перад тым як дасылаць чарговае паведамленне правакацыйнага зместу, варта задумацца, ці не нашкодзіць яно адрасату.

### Прынада для махляроў

Кантактныя дадзеныя, у прыватнасці адрас і тэлефон, таксама не варта пакідаць у адкрытым доступе. Памятайце, што зламыснікі ў любы момант могуць выкарыстаць гэтую інфармацыю ў незаконных мэтах, асабліва калі ведаюць, у які час вас не бывае дома.

### Планы на вечар

Для абмеркавання планаў на вечар ці выходныя лепш выкарыстоўваць асабістую перапіску або ствараць закрытыя групы. Інакш інфармацыя пра маляўнічы ўік-энд можа быць выкарыстаная супраць вас саміх (глядзіце папярэдні пункт).

### Беражыце свой кашалёк

Інфармацыя пра фінансавае становішча з'яўляецца, бадай, адной з самых сакрэтных. Ні ў якім разе нельга паведамляць пра памер вашага заробку і пра тое, дзе вы яго атрымліваеце і захоўваеце.

### Вы і ваша праца

Пад грыфам сакрэтнасці павінная застацца і інфармацыя аб вашай арганізацыі. Адным з самых яскравых прыкладаў такога выпадку з'яўляецца гісторыя з кампаніяй Microsoft. Праз профілі супрацоўнікаў «кампутарнага гіганта» ў сацыяльнай сетцы Linkedin журналістам неаднаразова ўдавалася атрымаць звесткі пра разнастайныя навінкі ці планы кампаніі за некалькі месяцаў да іх афіцыйнага апублікавання.

### Дзіцячыя фоты

Бяскрыўдныя на першы погляд фотаздымкі дзяцей насамрэч могуць стацца злым жартам для іх уладальніка. Па-першае, нельга забываць пра людзей, хворых на педафілію, а па-другое, інфармацыя аб тым, што дзіця застаецца дома адно, можа прывесці да наступстваў, апісаных вышэй.

### Паляўнічыя на кампрамат

Інфармацыя з вашага профілю таксама можа быць выкарыстаная іншымі сэрвісамі і ў выніку накіраваная супраць вас. Існуе нямала кур'ёзных выпадкаў, калі чалавек, адпрасіўшыся з працы з прычыны кепскага самаадчування, замест кабінета стаматолага бавіў час на якой-небудзь вечарынцы, а працадаўца выпадкова атрымліваў фота «цяжка хворага супрацоўніка».

### Сам сабе вораг

Даверліва публікаваць інфармацыю пра сябе, спадзеючыся толькі на тое, што наўрад ці хтосьці ўбачыць яе, акрамя самых блізкіх людзей, — памылка многіх карыстальнікаў. Памятайце, што большая частка дадаткаў да сацыяльных сетак прызначаная для доступу да канфідэнцыйнай інфармацыі.

**КаМ**

## Сапраўдная беларуская кухня

### Бручка па-гаспадарску

Некалькі бручак, 2 лыжкі масла, 400—800 г ялавічыны (з хваста) або гусіныя вантробы, 0,5 лыжкі мукі, масла або сала для падсмажвання, соль.

Абрацць бручку, абмыць, нарэзаць кубікамі, зварыць у падсоленай вадзе з кавалкам масла або ялавічынай (з хваста) да гатоўнасці. Муку падсмажыць на масле або сале, дадаць у страву і яшчэ патушыць.

Вельмі смачная бручка атрымліваецца з гусінымі вантробамі, якія надаюць ёй выдатны смак.

Пры падачы бручку абкласці кавалачкамі мяса або вантробаў.

**З кнігі Вінцэнты Завадскай «Літоўская кухарка», 1854**
**Падрыхтавала НБ**

## Прыватныя абвесткі

**ЛЕТНІК**

**Валанцёрскі летнік на Браслаўшчыне.** Кожны, хто хаця б раз быў на Браслаўшчыне, наўрад ці абмінуў зрокам перліну Беларусі, Слабодкаўскі касцёл. Намаганнямі дабрадзеяў ды саміх парафіянаў была зробленая рэстаўрацыя касцёла, але шмат што яшчэ патрабуе працы побач з касцёлам. Таму ўсіх, хто мае час і жаданне зрабіць унёсак, запрашаем на працу. Больш інфармацыі можна атрымаць, патэлефанаваўшы на нумар: (29) 715–36–68.

**ПРАЦА**

**Рэдакцыя інфармацыйных праграм тэлеканала «Белсат»** абвяшчае конкурс на вядоўцу штодзённай праграмы. Патрабаванні: досвед журналісцкай працы; эфірны голас; тэлевізійная знешнасць; бездакорная беларуская мова; магчымасць працы за мяжой. CV і матывацыйны ліст разам з некалькімі здымкамі дасылайце, калі ласка, на скрынку: abjektyu@belsat.eu

**СПАЧУВАННІ**

**У нядзелю, 4 ліпеня, адышоў у лепшы свет Іван Цімафеевіч Апет,** шчыры беларускі патрыёт, вязень сталінскага ГУЛАГу, сведка і ўдзельнік драматычных падзеяў, што разгортваліся на Беларусі падчас Другой сусветнай вайны. Шчырыя спачуванні ягоным сваякам і сябрам. Зямля пухам, Іване. Сваяк

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайта www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## Кемікі



1) Дзе гэта бывае: кругом вада, а з пітвом бяда?

2) Сын майго бацькі, а мне не брат.

3) Хто можа размаўляць на ўсіх мовах?

4) У каго барада з маленства ёсць?

**Сабрала Валянціна Карнялюк**

**Адказы глядзі на старонцы 16.**




**Адшугалі вогнішчамі купальскія святы. На фота: Купалле ў Заслаўі. Спявак Зміцер Вайцюшкевіч з русалкамі.**




**Пад Мінскам прайшоў злёт паветраплавальнікаў. Удзел бралі каманды сямі паветраных шароў з Беларусі, Літвы, Чэхіі, Украіны, Расіі.**



**У Віцебску абралі «Міс Інтэрнэт». Пуцёўку ў Крым і фотакамеру атрымала дваццацідвухгадовая Кацярына Ардынская. Конкурс праводзіцца з 2008 году. Сёлета ў галасаванні ўзяло ўдзел звыш трох тысяч чалавек.**




**Актывісты кампаніі «Гавары праўду» занеслі ў Мінгарвыканкам 100 тысяч подпісаў за наданне сталічнай вуліцы імя Васіля Быкава. Толькі 5 тысяч былі арыгіналамі — астатнія, кажуць актывісты, былі ў іх скрадзеныя. Уладзімір Някляеў так адрэагаваў на каментары скептыкаў: «Няўжо магчыма падрабіць сто тысяч подпісаў? Ідзіце і праверце іх».**

## Анекдоты

Дзяўчына, якая толькі што атрымала правы, упершыню падвезла маму дадому. Калі машына спынілася, маці сказала:

— Дзякую табе.

— Ды калі ласка! — адказала дачка.

— Я сказала гэта не табе, а Госпаду Богу.

* * *

— Любы, ніяк не магу вырашыць, які купальнік набыць: адкрыты або закрыты?

— Вядома, закрыты, толькі з дзірачкамі для вачэй.

* * *

Студэнт на экзамене выйшаў да прафесара адказваць, з сабой узяў толькі маленькі кавалачак паперы, на якім было напісана некалькі кароткіх радкоў. Прафесар:

— Ну і дзе ж ваш адказ?

Студэнт:

— У галаве.

— А гэта што? (Паказвае на паперку).

— Не змясцілася...

* * *

— Цікава, калі ты прачынаешся ў шэсць вечара і ясі суп, то як гэта называецца — сняданак, абед ці вячэра?

* * *

Аб'ява ў газеце: «Глуханямы ігрэц на вувузеле прыструніць вашых неспакойных суседзяў. Вынік гарантую!»

## «НН» сто гадоў з вамі

**Вёска Бель Горацкага павета.** У гаспадара С. Т-ва нарадзіўся хлопец. Поп ахрысціў яго Іванам. Праз дзень маці, купаючы яго, угледзела, што гэта дачка. Стала яна галасіць, сабраліся суседзі, раіліся, што рабіць. Паслалі кумоў да папа. Поп адразу асудзіў: «Завіце вярхоў!» Так і пакінулі хлапцом.

**«НН». №23—34. 1910**

**Васіль Быкаў:** Ключавы гістарычны момант для кожнай нацыі — гэта нацыянальны суверэнітэт і свая дзяржава. Калі ёсць незалежнасць — з'яўляюцца аб'ектыўныя ўмовы для развіцця нацыянальнай культуры; калі ж гэтага не будзе, калі Беларусь зробіцца чарговай правінцыяй Расійскай імперыі — вельмі хутка не будзе нічога. Не будзе беларускай культуры. Для мяне гэта абсалютна ясна, таму што слабая беларуская самасвядомасць не вытрывае той навалы масавай культуры, якая насоўваецца з Захаду, і дзяржаўніцкай таталітарнай русіфікацыйнай хвалі, што ідзе з Усходу.

**«НН». №26. 2000**

1) У моры. 2) Я сам. 3) Рэха. 4) У казла.

**Адказы са старонкі 15.**

**Наша Ніва**
незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Генадзевіч Скурко
заснавальнік — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА.** Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15–128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

**Наклад 6350.** **Газета выдаецца 48 разоў на год.**
Нумар падпісаны ў друк 23.00 13.07.2010.
Замова № 3352.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15–128.
Цана дамоўная.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
ISSN 1819-1614